Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

29 КРАСАВІКА 2016 г. ПЯТНІЦА № 80 (28190) Кошт 2400 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Ад чаго залежыць памер пенсіі?**

СТАР. 8



**Вандроўка без межаў**

СТАР. 20



**Праграма тэлебачання на тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Станіслаў ЗАСЬ, дзяржаўны сакратар Савета бяспекі:**

*«Прыярытэты сістэмы нацыянальнай бяспекі на бліжэйшую перспектыву абазначаны выразна. Кіраўнік дзяржавы ў Пасланні беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу гаварыў аб гэтым. Думаю, у такім жа ключы пытанне будзе гучаць і на маючым адбыцца V Усебеларускім народным сходзе. Думаю, што будзе ўзнята тэма аб тых мерах, якія прымаюцца па ўмацаванні бяспекі дзяржавы, бяспекі граніцы, умацаванні Узброеных Сіл, сіл правапарадку, забеспячэнні бяспекі людзей у краіне. Адпаведна, будуць ставіцца такія задачы і на бліжэйшую перспектыву».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 29.04.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 19382,00 ▼ | |
| Еўра | 22002,00 ▼ | |
| Рас. руб. | 297,96 ▼ | |
| Укр. грыўня | 769,43 ▼ | |

ISSN 1990 - 763X

# ГАСЦІННЫ ДВОР



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**У «Сядзібе Дудзіка» вёскі Залахвенне Быхаўскага раёна поўным ходам ідзе высадка расады памідораў. Тут заўсёды займаюцца вырошчваннем экалагічна чыстых прадуктаў.**

**— Мы чакаем гасцей — і сталых, і новых, — кажа малады гаспадар аграсядзібы Яўген Дудзік (*на фота*). — Рыхтуемся да вясенне-летняга сезона, каб паспець парадаваць адпачывальнікаў смачнай і карыснай гароднінай і садавінай.**

**Больш за дзве тысячы таматных каліўцаў гаспадары «Сядзібы Дудзіка» пасадзяць у новым сезоне ў цяпліцы і ў адкрытым грунце.**

■ Навацыі

## Бізнес, карысны грамадству

**Сацыяльныя праблемы могуць вырашыць неабыякавыя прадпрымальнікі**

**Хто павінен будаваць дзіцячыя садкі і развіваць турызм у рэгіёне? Эксперты сходзяцца на тым, што сацыяльную нагрузку мусіць несці не толькі дзяржава. Бізнесу таксама варта браць на сябе частку абавязкаў. Сёння ўсё часцей гавораць пра феномен сацыяльнага прадпрымальніцтва. Падобныя арганізацыі не толькі атрымліваюць прыбытак, але і вырашаюць ці змякчаюць пэўныя праблемы ў грамадстве: ад працаўладкавання інвалідаў да медыцынскага абслугоўвання пажылых. Перспектывы такога бізнесу і бар'еры для яго развіцця ў нашай краіне абмяркоўвалі падчас III Рэспубліканскага сацыяльнага форуму.**

### Попыт на цэнтры для пажылых

Ці шмат у Беларусі сацыяльных прадпрыемстваў? Згодна са статыстыкай, да гэтай катэгорыі можна аднесці 184 установы. Большасць з іх — фірмы, створаныя некамерцыйнымі арганізацыямі (напрыклад, Беларускім таварыствам інвалідаў) для рэалізацыі сваіх мэт. Такія прадпрыемствы рэгулярна перадаюць частку прыбытку свайму заснавальніку.

46 працэнтаў айчынных сацыяльных кампаній займаюцца вытворчасцю, яшчэ 44 працэнты аказваюць паслугі. Астатняя частка працуе ў сферы гандлю. Сярод вытворчых фабрык большасць — швейна-трыкатажныя. Таксама шмат заводаў, што выпускаюць пластмасавыя вырабы і металічныя канструкцыі. Невялікі працэнт прыпадае на долю мэблевай вытворчасці, дрэваапрацоўкі, сувенірнай прадукцыі, рытуальных рэчаў. Калі казаць пра паслугі, якія прапаноўваюць сацыяльныя прадпрыемствы, то гэта ў асноўным будаўніча-мантажныя работы, паліграфія, арганізацыя адпачынку і аздараўлення. Невялікая частка фірмаў рамантуе і абслугоўвае камп'ютары, аказвае бытавыя і бухгалтарскія паслугі.

СТАР. 8

■ Сталічная нерухомасць

## «КВАДРАТ» СТАЎ ПРЫВАБНЫМ

**Мінімальны цэннік аднапакаёвых кватэр у Мінску знізіўся да 29 тысяч долараў**

**Звычайна ў першыя месяцы вясны жыхары буйных гарадоў больш цікавяцца купляй дач. Аднак сёлета найбольшую актыўнасць на сталічным рынку нерухомасці выказваюць пакупнікі жылля. Тлумачэнне простае: за апошнія 12 месяцаў цэны на стандартныя кватэры тут знізіліся адразу на траціну і больш.**




### НОВАБУДОЎЛІ: МІНУС 20%

Самы высокі попыт цяпер назіраецца на першасным рынку жылля Мінска. Дзякуючы гэтаму зніжэнне цэн на новабудоўлі не толькі замарудзілася, але і па некаторых, найбольш запатрабаваных, аб'ектах яны пачалі расці, паведамляе **намеснік начальніка аддзела кансалтынгу і аналітыкі групы кампаній «Твая сталіца» Андрэй ЧАРНЫШОЎ**. У гэтай сітуацыі разлічваць на торг пры куплі новабудоўлі ўжо не варта.

СТАР. 4

# Калі адлегласць — не перашкода

## Беларусь прапануе Інданезіі стварыць сумесныя прадпрыемствы

**Аб гэтым Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка заявіў на сустрэчы з міністрам абароны Інданезіі Рыямізардам Рыякуду, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Прэзідэнт падкрэсліў, што закрытых тэм у супрацоўніцтве паміж краінамі няма. Беларусь гатова развіваць узаемадзеянне з Інданезіяй не толькі ў ваенна-тэхнічнай, але і ў грамадзянскіх сферах эканомікі. «Што немалаважна і прынцыпова для Інданезіі і Беларусі: мы можам пайсці на стварэнне сумесных прадпрыемстваў на інданезійскай зямлі, каб атрымліваць гатовы прадукт і прадаваць яго ў трэціх краінах у тым рэгіёне», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка таксама заявіў, што хацеў бы аднавіць сваё запрашэнне Прэзідэнту Інданезіі наведаць Беларусь. У ходзе візіту бакі змогуць вызначыць стратэгію далейшага развіцця адносін паміж дзяржавамі на бліжэйшую перспектыву.

У сваю чаргу міністр абароны Інданезіі Рыямізард Рыякуду падзякаваў Аляксандру Лукашэнку за аказаны дэлегацыі цёплы прыём і дадаў, што вынікі яго візіту будуць дакладзены Прэзідэнту Інданезіі. «Таксама я абавязкова перадам яму ваша запрашэнне», — дадаў Рыямізард Рыякуду.

Ваенная дэлегацыя Інданезіі 28-30 красавіка знаходзіцца з візітам у Беларусі. Плануецца, што яна правядзе перагаворы з кіраўніцтвам Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта і Міністэрства абароны Беларусі. Замежныя госці таксама маюць намер наведаць Цэнтральны камандны пункт ВПС і войскаў ППА Узброеных Сіл Беларусі, Мінскі завод колавых цягачоў і 558-ы Авіяцыйны рамонтны завод.

■ Нябачныя масты

# АГУЛЬНЫ ДОМ ДЛЯ БЕЛАРУСКІХ І КІТАЙСКІХ СТУДЭНТАЎ




Фота БЕЛТА.

**Неўзабаве ў Студэнцкай вёсцы ў Мінску з'явіцца восьмы інтэрнат. Адметнасць гэтага будынка ў тым, што ён будзе пабudаваны з кітайскай бязвыплатнай тэхніка-эканамічнай дапамогай. Днямі адбылася ўрачыстая цырымонія закладкі першага каменя пад будаўніцтва інтэрната для беларускіх і кітайскіх студэнтаў з капсулай-пасланнем будучым пакаленням.**

— Рэалізацыя гэтага праекта стала магчымай дзякуючы цесным сяброўскім адносінам паміж нашай краінай і Кітайскай Народнай Рэспублікай, — адзначыла **намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Наталля КАЧАНАВА**. — Пачатак будаўніцтва новага студэнцкага інтэрната — вельмі важная падзея. Мерапрыемства праводзіцца ў рамках рэалізацыі дамоўленасцяў, якія былі дасягнуты падчас візіту старшыні КНР Сі Цзіньпіна ў нашу краіну ў маі мінулага года.

— Сёння ў Беларусі навучаюцца каля дзвюх тысяч кітайскіх грамадзян. Цесныя і плённыя адносіны склаліся паміж нашымі ўніверсітэтамі. На базе беларускіх устаноў адукацыі адкрыта ўжо тры Інстытуты Канфуцыя і пяць класаў, — падсумавала вынікі супрацоўніцтва краін Наталля Качанава. — Праект, якому мы даём старт цяпер — гэта яшчэ адна вяха ў сферы адукацыі. Новы інтэрнат будзе часцінкай вялікага Кітая ў жылым комплексе «Студэнцкая вёска», а сумеснае пражыванне ў ім беларускай і кітайскай моладзі дасць новы імпульс развіццю цесных і добрасуседскіх адносін паміж нашымі краінамі.

На думку **міністра адукацыі Міхаіла ЖУРАЎКОВА**, новы інтэрнат прыцягне ў Беларусь, у прыватнасці ў Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт, больш студэнтаў з Кітая: «Спецыялісты, якія навучаюцца ў нас, а пасля вяртаюцца ў сваю родную краіну, з'яўляюцца «праваднікамі» беларускіх тэхналогій і навуковых здабыткаў. А гэта, безумоўна, толькі на карысць і Беларусі, і Кітаю».

Падрабязна пра будучы інтэрнат расказаў **прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай дзейнасці і развіцці ўніверсітэцкага гарадка Генадзь ЗЕМЛЯКОЎ:**

— Кітайскі бок удзельнічае ва ўсіх этапах будаўніцтва: ад прыняцця праекта да здачы інтэрната ў эксплуатацыю. Плануецца, што ўжо на пачатку мая мы распачнём будоўлю, а скончым яе ў снежні 2017 года. Дзесяціпавярховы інтэрнат разлічаны на пражыванне 1030 чалавек, гарманічна ўпішацца ў архітэктурны ансамбль Студэнцкай вёскі. Сума, якая будзе затрачана на будаўніцтва, эквівалентная 40 млн долараў.

**Ганна КУРАК.**

■ Знешняя палітыка

# НА ПАДСТАВЕ ДАВЕРУ

## Развіваем кантакты з Азіяй

**Міністр замежных спраў нашай краіны Уладзімір Макей з рабочым візітам знаходзіцца ў Кітаі. Пра гэта падчас чарговага брыфінгу паведаміў начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў нашай краіны Дзмітрый МІРОНЧЫК.**

У Кітаі кіраўнік знешнепалітычнага ведамства прымае ўдзел у пасяджэнні міністраў замежных спраў краін — членаў Нарады па ўзаемадзеянні і мерах даверу ў Азіі (НУМДА). Як адзначыў Дзмітрый Міронычк, наша краіна атрымала статус назіральніка пры гэтай аўтарытэтнай рэгіянальнай арганізацыі ў красавіку 2015 года. Сустрэчы міністраў замежных спраў нарады праводзяцца кожныя чатыры гады і з'яўляюцца асноўным форумам для правядзення кансультацый і разгляду ўсіх пытанняў дзейнасці арганізацыі.

— Для Беларусі НУМДА з'яўляецца пляцоўкай для прасоўвання нацыянальных інтарэсаў у Азіяцка-Ціхаакіянскім рэгіёне, — заявіў прадстаўнік МЗС. — Падключэнне Беларусі да ўдзелу ў палітычных механізмах Нарады па ўзаемадзеянні і мерах даверу ў Азіі стварыла дадатковы канал для развіцця і ўмацавання кантактаў з дзяржавамі-членамі і назіральнікамі, магчымасці для абмену думкамі па актуальных пытаннях міжнароднага і рэгіянальнага парадку дня, атрымання з «першых рук» аб'ектыўнай інфармацыі аб працэсах, якія адбываюцца сёння ў краінах Азіі.

Па словах Дзмітрыя Міронычка, у сваім новым статусе наша краіна можа далучыцца да працы галіновых механізмаў і тэматычных мерапрыемстваў арганізацыі. Пазітыўным фактарам у кантэксце ўдзелу Беларусі ў рабоце НУМДА з'яўляецца і наяўнасць у складзе нарады нашых стратэгічных партнёраў, перш за ўсё Расіі і Кітая, Казахстана — ініцыятара стварэння і найбольш актыўнага ўдзельніка арганізацыі. Важную ролю ў працы НУМДА выконваюць і такія краіны, як Іран і Турцыя, з якімі Беларусь падтрымлівае канструктыўны дыялог.

НУМДА — буйны рэгіянальны форум па развіцці і ўмацаванні супрацоўніцтва, бяспекі, эканамічнага росту і стабільнасці ў Азіі. Першы саміт НУМДА адбыўся ў 2002 годзе. Сёння арганізацыя аб'ядноўвае дваццаць шэсць краін Цэнтральнай, Паўднёва-Усходняй Азіі, Блізкага Усходу і Паўночнай Афрыкі. Гэта краіны, якія вырабляюць трэць сусветнага ВУП, іх насельніцтва складае больш за 4 млрд чалавек. Дзевяць краін і чатыры міжнародныя арганізацыі, у тым ліку ААН, АБСЕ, Ліга арабскіх дзяржаў маюць статус назіральнікаў пры НУМДА. Мэты і задачы нарады падобныя да мэт і задач такіх рэгіянальных арганізацый як ШАС, АСЕАН, АДКБ. Узаемадзеянне дзяржаў-членаў ажыццяўляецца ў рамках прыярытэтных напрамкаў: эканоміка, экалогія, гуманітарнае і ваенна-палітычнае супрацоўніцтва, барацьба з новымі выклікамі і пагрозамі: тэрарызм, адмыванне незаконных даходаў, кантрабанда наркотыкаў, гандаль людзьмі.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

*yushkevich@zviazda.by*

■ На тэму дня

# Галоўны выклік



**Штогадовы зварот Прэзідэнта да народа і Нацыянальнага сходу — гэта нагода задумацца над шматлікімі стратэгічнымі пытаннямі развіцця краіны і сучаснасці іх са штодзённымі падзеямі. Традыцыйна цэнтральная ўвага ў звароце надаецца пытанням сацыяльна-эканамічнага блоку. Але ж і знешняя палітыка там, зразумела, абавязкова прысутнічае.**

Гэтым разам знешнепалітычная частка змясціла некалькі, здавалася б, звыклых і простых, але ж вельмі важных тэзісаў. У прыватнасці, пра тое, што для Беларусі непрымальная дылема Усход-Захад. Іншымі словамі, само пытанне — вы з Расіяй ці з Захадам? — супярэчыць базавым інтарэсам краіны. І якім бы банальным гэты тэзіс ні здаваўся, насамрэч яго штодзённая рэалізацыя сутыкаецца з даволі сур'ёзнымі праблемамі.

Справа ў тым, што суседзі і замежныя партнёры нас часта проста не разумеюць: маўляў, як так — і з Захадам, і з Усходам?

Больш за тое, калі быць шчырымі, то і ў самім беларускім грамадстве далёка не ўсе ўсведамляюць практычнае значэнне гэтага тэзіса. На агульнатэарэтычным узроўні, бадай, кожны беларус скажа, што наша краіна зацікаўлена ў аднолькава добрых стасунках з усімі суседзямі. І нават зацікаўлена ў тым, каб і паміж Расіяй з Захадам былі максімальна пазітыўныя адносіны. Бо гісторыя ўжо не адзін раз прыносіла на нашу зямлю трагедыі, калі ў выніку канфліктаў паміж Захадам і Усходам праліваліся менавіта беларуская кроў. Таму і сацыялагічныя даследаванні паказваюць, што беларускае грамадства хоча заставацца па-за межамі канфліктаў і нармальна супрацоўнічаць з усімі.

Але ж пад уплывам інфармацыйных войнаў, што сталі неад'емным кампанентам міжнароднай палітыкі, значная частка грамадства і нават сёй-той з экспертаў нярэдка губляюцца ў трактоўцы базавых нацыянальных інтарэсаў Беларусі. На фоне павышанай эмацыйнасці геапалітычнага супрацьстаяння ў нашым рэгіёне шмат хто ў ацэнках беларускіх інтарэсаў пачынае «ісці за медыйнымі загалоўкамі».

Такое неразуменне, як з боку замежных партнёраў, так і ўнутры краіны, на маю думку, з'яўляецца сёння нашым галоўным знешнепалітычным выклікам.

Пры гэтым, вядома, не варта занадта драматызаваць такую сітуацыю. Шмат у чым гэта звычайная рэальнасць для малых краін у міжнародных стасунках.

А мы з'яўляемся менавіта малой краінай, згодна з тэорыяй міжнародных адносін. Гэта не абраза ці нейкае прыніжэнне статусу — гэта тэарэтычны канцэпт, які дазваляе нам лепш зразумець нашу краіну як неад'емную частку сістэмы міжнародных адносін. Сярод навукоўцаў няма адзінага падыходу да класіфікацыі малых краін: якія дакладна крытэрыі вызначаюць, з'яўляецца краіна малой, сярэдняй ці вялікай дзяржавай?

Напрыклад, адны даследчыкі звяртаюць увагу на лічбавыя паказчыкі: якое ў краіны насельніцтва, колькі яна займае тэрыторыі, альбо які яе валавы ўнутраны прадукт. Іншыя глядзяць на магчымасці краіны ў сістэме сусветнай палітыкі. Згодна з такім падыходам, да малых краін адносяцца тыя, што не маюць рэсурсаў, каб самастойна змяняць навакольнае міжнароднае асяроддзе, а таму вымушаны прымаць яго і нейкім чынам прыстасоўвацца.

Беларусь пры любым падыходзе адносіцца да малых краін і таму сутыкаецца з міжнароднымі выклікамі, якія шмат у чым падобныя да праблем іншых малых краін у свеце. Адна з іх — тое, што вялікія дзяржавы звычайна з цяжкасцю ўспрымаюць нашы інтарэсы і схільныя да таго, каб упісваць нас у свае ўласныя інтарэсы. Ці ў свае ўласныя нарматывы, г. зн. навязваюць нам свае ўяўленні пра тое, што добра, а што не. Асабліва відавочна гэта праяўляецца, калі паміж вялікімі краінамі ці блокамі краін пачынаюцца нейкія канфлікты.

А менавіта такія канфлікты мы ў апошнія гады і назіраем у нашым рэгіёне. І адразу то з аднаго, то з другога боку пачынаюцца спробы «замацаваць» нас на пазіцыях, выгадных вялікім гульцам міжнароднай палітыкі. А калі мы адмаўляемся прымыкаць да аднаго з бакоў, адразу пачынаюцца крыўдлівыя пытанні: чаму вы так сябе паводзіце?

Адказ тут да немагчымасці банальны: таму што ў нас аб'ектыўна існуюць свае інтарэсы. Бо інтарэсы — гэта не пытанне памеру краіны ці яе геапалітычнага месцазнаходжання. Уласныя інтарэсы абсалютна натуральна і легітымна з'яўляюцца ў любога суб'екта ўзаемаадносін — ці то міжчалавечых, ці то міждзяржаўных. Геаграфія і геапалітыка, зразумела ж, вызначаюць у вялікай ступені спецыфіку гэтых інтарэсаў. Але ж важны сам факт: там, дзе ёсць суб'ектнасць, аўтаматычна будуць і ўласныя інтарэсы.

Дарэчы, тут ёсць і іншая праблема. Гэта старая дыскусія аб тым, як фарміруюцца інтарэсы краін. У апошнія дзесяцігоддзі навукоўцы ўсё больш адыходзілі ад такога паняцця, як нацыянальныя інтарэсы. Больш распаўсюджаным станавіўся падыход, згодна з якім паводзіны краін у міжнароднай палітыцы дыктуюцца інтарэсамі іх эліт, нават асобных палітыкаў.

У гэтым кантэксце праблемай нашай краіны было тое, што пэўны час камунікацыя з заходнім светам у нас заставалася на надзвычай нізкім узроўні. Ва ўмовах адсутнасці поўнай інфармацыі пра Беларусь і сапсаваных адносін, натуральна, і палітыкі, і эксперты на Захадзе былі схільныя да таго, каб трактаваць нашы знешнепалітычныя дзеянні не з пункту гледжання аб'ектыўных нацыянальных інтарэсаў, а праз міфалагізаваныя ўяўленні пра інтарэсы кіраўніцтва краіны.

Сёння адкрываецца ўсё больш магчымасцяў такія міфалагізаваныя ўяўленні развейваць. І калі нас да гэтага часу не разумеюць, то трэба шукаць новыя шляхі тлумачэння. Іншую мову, іншыя пляцоўкі.

Але ж самае галоўнае — гэта ўнутраная дыскусія, якая мусіць аб'ядноўваць у Беларусі ўсіх, каму ёсць што сказаць. Ад міністраў і да выкладчыкаў універсітэтаў ці нават студэнтаў. Апошнім часам асобныя такія пляцоўкі пачалі ўзнікаць. У якасці прыкладу можна прывесці і шматлікія цікавыя дыскусіі на ток-шоу, і палемічныя публікацыі ў СМІ, і асобныя канферэнцыі. Пры гэтым крытычна важна, каб такіх фарматаў было як мага больш.

Бо яны ствараюць агульны нацыянальны дыскурс, агульную каштоўнасную і аналітычную прастору. А гэта адзіны шлях не проста лепей разумець адзін аднаго ў грамадстве, але ж і разумець галоўныя нацыянальныя каштоўнасці: незалежнасць і развіццё Беларусі.

Дыскусійныя пляцоўкі таксама збліжаюць тэарэтычныя развагі і практычныя аргументы. Іншымі словамі, вырашаецца распаўсюджаная сёння праблема, калі шматлікія палітычныя каментатары элементарна не разумеюць некаторых рэалій прыняцця дзяржаўных рашэнняў. І не могуць разумець, бо не ўдзельнічаюць у рэгулярных дыскусіях з тымі, хто такія рашэнні прымае.

Калі ў краіне будзе шмат якасных экспертных і дыскусійных пляцовак, то інтэлектуальны патэнцыял і тэарэтыкаў, і практыкаў будзе працаваць у адным кірунку — на карысць нацыянальным інтарэсам краіны. І тады ўжо з больш моцнай унутранай пазіцыі можна будзе тлумачыць беларускія нацыянальныя інтарэсы нашым замежным партнёрам.

Дарэчы, менавіта з гэтай мэтай напачатку мая наша экспертная ініцыятыва «Мінскі дыялог» ладзіць адмысловую міжнародную канферэнцыю пад назвай «Асэнсаванне міжнароднай бяспекі Беларусі».

**Яўген ПРЭЙГЕРМАН**

■ Векапомнае

# ПЕРАМОГА — АДНА НА ЎСІХ

## Міжнародны форум «Вялікая Перамога, здабытая адзінствам» сабраў у Мінску ветэранаў з многіх былых рэспублік СССР

**Гісторыю трэба берагчы. Такі лейтматыў сёлетняга форуму, які ўжо шосты год запар збірае ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, дзяржаўных дзеячаў, экспертную і навуковую супольнасці, журналістаў, лідараў маладзёжных арганізацый краін СНД, Балтыі і Грузіі. У такім фармаце пра гісторыю Другой сусветнай вайны ў сучасным кантэксце, яе інтэрпрэтацыю і агульную памяць нашчадкаў упершыню пагаварылі ў Мінску — на тэрыторыі той краіны, якая найбольш пацярпела ад фашысцкай навалы, заплаціўшы вялікую цану за Перамогу.**

Сёння нельга пераацаніць той важкі ўклад, які ўнёс кожны народ у наша цяперашняе свабоднае і мірнае жыццё. Пра гэта сказаў і Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў сваім прывітальным слове да ўдзельнікаў і гасцей форуму. «Наш святы абавязак зрабіць усё дзеля захавання гістарычнай праўды, каб урокі Вялікай Айчыннай вайны ніколі не былі аддадыя забыццю. У страшным супрацьстаянні з гітлераўскім фашызмам мы перамаглі, бо былі разам», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

— Памятаючы Брэсцкай крэпасці і Ленінградзе, змагаючыся пад Масквой, Сталінградам, на Курскай дузе, Дняпры, вызваляючы Беларусь, штурмуючы Берлін, воіны Чырвонай Арміі не думалі пра нацыянальнасць, — перакананая **міністр інфармацыі Беларусі Лілія АНАНІЧ**. — Яны былі адзінымі, узрымаючы сцяг Перамогі. Значыць, і Перамога была адзінай і будзе заўсёды непадзельнай. Таму вельмі важна, каб на форуме прагучалі словы аб непарушнасці братэрства народаў, аб важнасці жыць у міры, аб тым, каб маладое пакаленне шанавала подзвіг бацькоў, каб сродкі масавай інфармацыі заўсёды былі на варце абароны і ўрокаў, і праўды той вялікай вайны.

Як лічыць **Дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Рыгор РАПОТА**, такога роду форумы настройваюць на тое, каб мы яшчэ раз, ужо з пазіцыі сучаснасці, асэнсавалі Вялікую Айчынную вайну: што прывяло да яе, як яна вялася, як паводзілі сябе палітыкі, і самае галоўнае, якія высновы можна зрабіць з гэтага трагічнага вопыту.

— Напярэдадні 71-й гадавіны Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, самай жудаснай вайне ў гісторыі чалавецтва, людзі адчуваюць складаныя пачуцці: з аднаго боку, радасць за перамогу праўды, з другога — смутак аб палеглых за свабоду нашай Радзімы і пакладненне перад подзвігам тых, хто перамог у вайне, — адзначыў **начальнік упраўлення прэзідэнта Расійскай Федэрацыі па міжрэгіянальных і культурных сувязях з замежнымі краінамі Уладзімір ЧАРНОЎ**. — Мы шануем подзвіг беларускага народа, які першым стаў на шляху ворага і геройчна змагаўся за нашу будучыню. Менавіта ад сцен Брэсцкай крэпасці пачыналася дарога да доўгачаканай перамогі. Гэта наша агульная гісторыя, якую мы абавязаны аберагаць і абараняць ад спроб перагляду. У жудаснай вайне мы змаглі выстаяць, бо былі разам. І сёння мы павінны быць адзінымі ў імкненні да міру і ўзаемаразумення.

«Сёння вельмі важна расказаць правільна аб Вялікай Айчыннай вайне, — упэўнены **спецыяльны прадстаўнік прэзідэнта Расійскай Федэрацыі па міжнародным культурным супрацоўніцтве Міхаіл ШВЫДКОЙ**. — Мала сказаць праўду, трэба сказаць так, каб яе пачулі. Пачулі не толькі розумам, але і сэрцам. А гэта вельмі складана. Важна, каб людзі адчулі, што мы перамаглі, якую ролю адыграла наша краіна, нашы народы. І ў гэтым сэнсе такія сустрэчы, безумоўна, вельмі важныя. Горка, што кожны раз прыязджае ўсё менш і менш людзей, але яны, пакуль жывыя, з'яўляюцца для нас нейкім нацыянальным здабыткам».








Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Пра гэта казаў у сваім Пасланні да беларускага народа і Нацыянальнага сходу і Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

— У сваім Пасланні Аляксандр Рыгоравіч вельмі выразна акцэнтаваў увагу на спробах фальсіфікацыі вобразу Беларусі, вобразу яе мінулага, культурнай бяспецы краіны і актыўным інфармацыйным супрацьдзеянні, — падкрэсліў **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Ігар МАРЗАЛЮК**. — Усе гэтыя пытанні вельмі цесна звязаныя з тымі аспектамі, якія разглядаюцца падчас форуму. На жаль, існуюць дзве тэндэнцыі, звязаныя з вобразам мінулага Беларусі, у прыватнасці Вялікай Айчыннай вайны. Адзін вобраз — ультрарадыкальны-нацыяналістычны, калі адмаўляецца сам факт гераізму беларускага народа ў вайне, які паказваецца ахвярай паміж молатам і кавадлам. У другім варыянце Беларусі таксама няма. Ёсць геройчны непадзельны рускі народ, які таксама стагнаў пад ігам, — тое, што я называю ўласаўскай расійскай гістарыяграфіяй, хоць, безумоўна, яе нельга назваць гісторыяй. Многія забываюцца, што Савецкі Саюз перамог яшчэ і таму, што была тая нацыянальная палітыка, якую так клянуць рускія нацыяналісты сёння. Таму трэба памятаць, што ёсць у гісторыі факты, якія нельга ні перапісаць, ні выкінуць. Мы ў рэшце павінны пачаць спакойна, непрадузята разглядаць працэсы і з'явы такімі, якімі яны былі на самой справе.

Іншыя актуальныя пытанні асвятлення Вялікай Айчыннай вайны ў гістарыяграфіі і СМІ, шляхі захавання і перадачы агульнай памяці, сучасны стан і перспектывы развіцця маладзёжных патрыятычных праектаў на прасторы СНД актыўна абмяркоўваліся падчас тэматычных секцый. Прадстаўнікі маладзёжных арганізацый прэзентавалі навуковыя, адукацыйныя і сацыяльныя праекты, звязаныя з ушанаваннем памяці аб Вялікай Перамозе. Гісторыкі і эксперты агучылі ролю навуковай грамадскасці ў даследаваннях праблемных эпізодаў вайны, пытанні папулярызацыі аб'ектыўных гістарычных ведаў аб Вялікай Айчыннай вайне і супрацьдзеяння фальсіфікацыі мінулых падзей.

Грамадская супольнасць сёння вымушана адстойваць сваю гісторыю, яшчэ раз даказваць даўно вядомыя ісціны, рабіць усё дзеля таго, каб не дапусціць скажэння мінулых падзей, рэабілітацыі фашызму і прыніжэння ролі савецкіх народаў у перамозе ў Другой сусветнай вайне. Невыпадкова падобныя аргументы сёння гучаць з міжнароднай трыбуны. Найбольш цікавыя і слушныя з іх — у найбліжэйшы час на старонках «Звязды».

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

■ Надвор'е

# ПРОСТА СОНЕЧНЫЯ ВЫХАДНЫЯ...

## У суботу і нядзелю сіноптыкі абяцаюць да плюс 18 градусаў

**Даволі камфортнае і цёплае надвор'е чакаецца ў найбліжэйшыя дні на тэрыторыі нашай краіны, паведамляе начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Дзмітрый РАБАЎ.**



А сёння ў нас будзе гаспадарыць зона павышанага атмасфернага ціску, таму чакаецца пераважна без ападкаў, толькі раніцай і ўдзень на захадзе пройдуць кароткачасовыя дажджы. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе плюс 12-18 градусаў, на паўночным захадзе — ад 9 да 11 цяпла.

Амаль не будзе ў нас ападкаў і ў суботу, толькі па паўднёвым захадзе месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у некаторых раёнах магчымы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад аднаго да васьмі цяпла. Па поўначы пры праясненнях чакаюцца замаразкі, калі будзе ад нуля да мінус двух градусаў. Тэмпература ўдзень прагназуецца ад 11 да 18 цяпла. Па паўднёвым захадзе пры дажджах — плюс 8-10 градусаў.

Пераважна без ападкаў будзе і ў першы дзень мая, аднак па паўднёвым захадзе месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у некаторых раёнах магчымы туман. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад 2 да 10 цяпла, аднак па поўначы пры праясненнях чакаецца ад нуля да мінус двух градусаў. Удзень сонечна і плюс 11-18 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

■ Актуальна

# Традыцыйны і непаўторны

## У праграме сёлетняга «Славянскага базару» — 17 канцэртаў

**Намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Наталля КАЧАНАВА правяла пасяджэнне арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні XXV міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску».**

«За 25 гадоў свайго існавання «Славянскі базар» стаў сімвалам Беларусі. Сёлета пройдзе юбілейны фестываль, таму мы павінны распрацаваць адметную праграму і правесці яго на дастойным узроўні», — адзначыла Наталля Качанава.

Адметна, што 25-годдзе «Славянскага базару» пройдзе з 14 па 18 ліпеня ў кантэксце Года культуры. Падчас пасяджэння аргкамітэта была разгледжана праграма асноўных мерапрыемстваў фестывалю, абмеркаваны шэраг значных пытанняў па яго правядзенні. Традыцыйна асноўнай фестывальнай падзеяй, вакол якой будзе сфарміравана праграма, стане міжнародны конкурс выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2016», у праграму таксама ўвойдуць урачыстыя цырымоніі і гала-канцэрты адкрыцця і закрыцця, міжнародны дзіцячы музычны конкурс, Дзень дружбы і Дзень моладзі. Яркім момантам сёлетняга «Славянскага базару» стане святочнае шэсце артыстаў, гасцей і ўдзельнікаў у дзень яго адкрыцця. У Летнім амфітэатры пройдзе 17 канцэртных праграм, уключаючы два начныя канцэрты. Таксама плануюцца праекты: «Тэатральныя сустрэчы», «Фестываль без межаў», «Лялечны квартал», «Кірмаш талентаў», II фестываль вулічнага мастацтва «На сямі вятрах».

У фестывальныя дні на адкрытых пляцоўках Віцебска традыцыйна разгорнецца «Горад майстроў», будзе арганізавана праца нацыянальных падворкаў краін, рэгіянальных падворкаў усіх абласцей Беларусі з продажам вырабаў народных майстроў, выступленнямі артыстаў і дэгустацыяй страў нацыянальнай кухні.

**Марына ВЕСЯЛУХА.** *vesialuha@zviazda.by*

## Меркаванне

# ВЫЙГРАЮЦЬ ТЫЯ, У КАГО ВЫДАТНЫЯ НАСТАЎНІКІ

### Член Савета Рэспублікі каментуе Пасланне кіраўніка дзяржавы



Фота БЕЛТА.

**У Пасланні беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на сферу адукацыі. Яна патрабуе якаснага ўдасканалення, мусіць быць арыентавана на вырашэнне сённяшніх праблем, а падрыхтоўка і перападрыхтоўка кадраў павінна адпавядаць патрэбам эканомікі. Свае думкі на гэты конт выказаў Ігар МАРЗАЛЮК, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, загадчык кафедрай археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А. Куляшова, доктар гістарычных навук, прафесар:**

— Варта больш дбайна і ашчадна падыходзіць да дзяржаўнага заказу ў сістэме вышэйшай адукацыі. Калі ласка, за свае грошы вучыся хоць трыццаць гадоў. Але, зноў-такі, які ў нас крытэрый набору на «бюджэт» і на «пазабюджэт»? Чаму студэнт, які паступае на навучанне за кошт дзяржавы, але дрэнна вучыцца, і той, хто паступіў на платнае, але вучыцца добра, амаль не маюць шанцу замяніць адзін аднаго?

І яшчэ, што тычыцца колькасці саміх універсітэтаў. Ёсць дзяржаўныя Віцебская ветэрынарная і Горацкая сельскагаспадарчая акадэміі. Ці патрэбны ў нашай краіне дзве ВНУ такога маштабу? Магчыма, філіялы — тут згаджуся.

Безумоўна, роля настаўніка павінна быць іншай. Мы не-як забываемся на ісціну Ота фон Бісмарка, які казаў, што ўсе войны ў свеце выйграе звычайны настаўнік матэматыкі. Можна сказаць інакш: у сучаснай канкурэнтнай барацьбе выйграюць тыя, у каго выдатныя настаўнікі.

Сёння ў беларусаў няма, на жаль, культу ведаў. Памятаеце даўнюю студэнцкую мудрасць, што лепш мець сіні дыплом і чырвоны твар, чым чырвоны дыплом і сіні твар? Калі чалавек пяць гадоў вучыўся на «выдатна» ці скончыў магістратуру, то ён адразу пасля заканчэння ВНУ павінен мець канкрэтны больш высокі кар'ерны старт, а не стаяць на роўных з тымі, хто вучыцца дрэнна.

Мы павінны падыходзіць дыферэнцавана да вучэбнага працэсу. Напрыклад, у Султанаце Аман працуе амерыканская сістэма ацэнкі студэнтаў. Дрэнна вучышся (маеш толькі 10-15% па профільных дысцыплінах) — не зможаш зрабіць нармальнай кар'еры, уладкавацца на добрую працу. Калі ў навучэнца гэты паказчык 60% — гэта ўжо зусім іншы шлях і перспектыва ў працы. Тое, што моладзь прагматычная і рацыянальная, — цалкам нармальна. Таму тых, хто шмат гадоў паказваў сябе найлепшым чынам, мы павінны больш падтрымліваць.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■

## Партнёрства

# ШКОЛА ДЛЯ ПРАКУРОРА

### Генеральная пракуратура нашай краіны і Савет Еўропы правялі сумесную канферэнцыю

**Яна прысвечана прафесійнаму навучанню суддзяў і пракурораў. Як паведаміў у размове з журналістамі Аляксандр КАНЮК, генеральны пракурор нашай краіны, мерапрыемства праводзіцца па ініцыятыве Савета Еўропы.**

На канферэнцыю прыехалі як прадстаўнікі міжнародных арганізацый, універсітэтаў, так і практыкі з Арменіі, Азербайджана, Грузіі, Казахстана, Кыргызстана, Малдовы, Расіі, Украіны.

— Прыбылі вельмі знакавы чыноўнік з Англіі, каб расказаць, якая сістэма падрыхтоўкі суддзяў і пракурораў у іх, — звярнуў увагу Аляксандр КАНЮК.

**Філіп БУАЯ, дырэктар Генеральнага дырэктарата па правах чалавека і вяршэнстве права Савета Еўропы,** падзякаваў генеральнай пракуратуры нашай краіны за дапамогу ў арганізацыі канферэнцыі.

— Доўгатэрміновая мэта Савета Еўропы — убачыць Беларусь у складзе сваіх дзяржаў-членаў, — заявіў Філіп Буая. — Спадзяюся, што канферэнцыя будзе садзейнічаць гэтай мэце.

Ён нагадаў, што наша краіна ўжо з'яўляецца ўдзельніцай 10 канвенцый Савета Еўропы.

— Як сказаў міністр замежных спраў вашай дзяржавы генеральнаму сакратару Савета Еўропы ў снежні мінулага года, Беларусь разглядае магчымасць далучыцца і да іншых канвенцый Савета Еўропы, — адзначыў Філіп Буая. — Падчас знаходжання ў Беларусі ў мяне адбудуцца двухбаковыя сустрэчы, у тым ліку і ў Міністэрстве замежных спраў, для таго, каб паглядзець, якім чынам можна было б рухацца ў гэтым кірунку.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■

# «КВАДРАТ» СТАЎ ПРЫВАБНЫМ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Між іншым, аналіз больш працяглага перыяду сведчыць аб тым, што тэндэнцыя на патанненне нерухомасці працягваецца. Толькі за першы квартал года цэны знізіліся ў сярэднім на 5%, а за год — больш чым на 20%.

Асаблівую цікавасць у пакупнікоў выклікаюць новабудоўлі ў прыгарадзе Мінска, якія прадаюцца з чыставым рамонтам. Менавіта яны і складаюць рэальную канкурэнцыю кватэрам другаснага рынку. У той жа час прыгарадныя новабудоўлі без рамонту пачынаюць паступова здаваць свае пазіцыі ў рэйтынгу пакупніцкіх пераваг.



### Рэкордны сакавік

Мінулы сакавік аказаўся незвычайна актыўным для вясновых месяцаў апошніх пяці гадоў і на другасным рынку сталічнага жылля, калі быў пастаўлены рэкорд па колькасці зарэгістраваных здзелак. Такая актыўнасць пакупнікоў характэрная для перыядаў эканамічнага дабрабыту, а ў сённяшняй сітуацыі, пры сціплых даходах насельніцтва і адсутнасці даступных крэдытаў, асноўнай прычынай скачка колькасці праведзеных здзелак эксперты называюць істотнае зніжэнне цэн ва ўсіх сегментах рынку жылля. Сёння таннеюць як стандартныя кватэры, гатовае для пражывання жыллё з рамонтам і мэбляй, так і элітныя кватэры.

**Кватэры, якія патрабуюць значнага рамонту, не вітаюцца пакупнікамі, паколькі прагназаваныя буйныя сумы трат на правядзенне рамонту перакрэсліваюць усю эканамічную выгаду набыцця падобнай кватэры.**

Ціск на ўзровень цэн аказвае вялікі аб'ём прапановы на рынку. Пікавае значэнне было зафіксавана ў пачатку сакавіка, калі колькасць аб'ектаў, якія былі выстаўлены па продаж, перавысіла лічбу ў 9 700 кватэр.

«Менавіта сёлетні веснавы «цэнапад» дазволіў набыць кватэру тым пакупнікам, хто яшчэ год таму не мог пра гэта нават марыць», — удакладняе сітуацыю на рынку **намеснік дырэктара па продажах на другасным рынку жылля сталічнага агенцтва Святлана КУДЗЕЛКА**. Напрыклад, у сакавіку мінімальны кошт знаходзіўся на ўзроўні 29 тысяч долараў за аднапакаёвую, 34 тысячы за двухпакаёвую і 42 тысячы долараў — за трохпакаёвую кватэру. Роўна год таму мінімальны кошт кватэр бюджэтнай катэгорыі быў на 30% вышэй.

### Абмен — актуальны

Гэтай вясной пачалі заключаць здзелкі і тыя патэнцыйныя пакупнікі, якія ўжо маюць уласную нерухомасць, але жадаюць пашырыць жылплошчу праз абмен з даплатай. Сённяшняя сітуацыя з мінімальнаю дэльтаю паміж рознымі тыпамі кватэр дазваляе ажыццяўляць падобныя аперацыі клієнтам нават са сціплымі зберажэннямі.

Напрыклад, цяпер розніца кошту кватэр, у залежнасці ад колькасці пакояў, дазваляе праводзіць абмен на кватэру большай плошчы з даплатай у 7–10 тысяч долараў, у той час як год-два таму даплата пачыналася ад 20 тысяч «зялёных». Усе гэтыя фактары актывізавалі тых пакупнікоў, хто адкладваў набыццё кватэры ў чаканні яшчэ большага зніжэння цэн.

Паводле інфармацыі аналітыкаў у сферы другаснага рынку жылля, сёлета за сакавік сярэдні кошт квадратнага метра жылля стандартных кватэр знізіўся на 5%. Цяпер рэальны кошт квадратнага метра складае па аднапакаёвых кватэрах каля 1075 долараў, для двухпакаёвых — 985 долараў, а для трохпакаёвых кватэр — 950 долараў. Усяго з пачатку года цэны знізіліся на 7%, або прыкладна на 80 долараў за «квадрат».

Сярэдні кошт квадратнага метра ў гатовых да пражывання кватэрах (якія маюць свежы сучасны рамонт і мэблю) за сакавік знізіўся нязначна. У аднапакаёвых кватэрах цэннік квадратнага метра цяпер складае 1 225 долараў, для двухпакаёвых — 1 170 долараў, а ў трохпакаёвых кватэрах — 1 160 долараў. Сярэдні цэннік такога тыпу жылля ў мінулым месяцы склаў па аднапакаёвых кватэрах 35 тысяч долараў, па двухпакаёвых — 43 тысячы, па трохпакаёвых — 68 тысяч, а па чатырохпакаёвых кватэрах — 72 тысячы долараў.

### Не напалохаць удачу

У сённяшняй няпростай сітуацыі на рынку нерухомасці рыэлтары нават распрацавалі спецыяльныя парады прадаўцам і пакупнікам. Напрыклад, Святлана Кудзелка лічыць, што для прадаўцоў успех пакупніцкай актыўнасці не павінен стаць падставай для ўзняцця цэн. Наадварот, неабходна максімальна эфектыўна скарыстацца момантам, каб да кожнага патэнцыйнага пакупніка праяўляць асаблівую лаяльнасць. Бо ў сітуацыі, калі цэны рухаюцца ўніз, час пошуку кліента на кватэру раўняецца ўпушчанай выгадзе прадаўца — чым ён меншы, тым меншыя страты прадаўца.

Акрамя таго, сур'ёзным канкурэнтам для прадаўцоў другаснага рынку выступаюць новабудоўлі, якія прапануюць не толькі шырокі выбар па мінімальных цэнах у рублях, але і растэрміноўку аплаты за набытую кватэру на некалькі гадоў.

Пакупнікам сёння, ва ўмовах вялікай колькасці прапаноў, карэкціроўкі цэн і дынамічнага руху рынку, складана зрабіць выбар. У той жа час эксперты не рэкамендуюць значна расцягваць працэс выбару аб'екта — ужо многія патэнцыйныя пакупнікі сутыкнуліся з сітуацыяй, калі, чакаючы яшчэ большага зніжэння цэн, упускалі свой варыянт.

### Сучасныя прыярытэты

Пасля дасканалага аналізу другаснага рынку жылля эксперты заўважылі, што, хутчэй за ўсё, сёлета знаходзяць свайго пакупніка тыя кватэры, якія патрабуюць касметычнага рамонту. Прычыну іх папулярнасці эксперты бачаць у іх кошце, які ніжэй за сярэдні на рынку. Пры гэтым кватэры, якія патрабуюць значнага рамонту, не вітаюцца пакупнікамі, паколькі прагназаваныя буйныя сумы трат на правядзенне рамонту перакрэсліваюць усю эканамічную выгаду набыцця падобнай кватэры. А вось кватэры з добрым сучасным рамонтам выбралі ў сакавіку каля 30% усіх пакупнікоў.

Папулярныя таксама кватэры, размешчаныя ў спальных раёнах горада. Справа ў тым, што разам з ростам курсу валют і зніжэннем як цэн, так і арэндных ставак на нерухомасць, упала і інвестыцыйная даходнасць жылля. Таму колькасць інвестыцыйных здзелак з кватэрамі старога жылога фонду (сталінкі, хрушчоўкі, брэжнеўкі), размешчаных у цэнтры горада, за апошні год знізілася да мінімуму. Бо, як правіла, падобныя кватэры купляюцца не «для жыцця», а для здачы ў арэнду. У той жа час кватэры стандартных спажывецкіх якасцяў з «прапіскаю» ў спальных раёнах прыцягваюць сваім коштам і «свежым» годам пабудовы дома.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*


## Извещение о проведении аукциона по продаже в частную собственность земельного участка для строительства и обслуживания жилого дома

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Дата, время, место проведения аукциона** | **01 июня 2016 года в 10.00 в здании райисполкома (г. Поставы, пл. Ленина, 25, 4-й этаж, малый зал)** | | | | | | |
| **Адрес, площадь, кадастровый номер земельного участка, начальная цена** | **№ п/п** | **Адрес участка** | **Площадь, га** | **Кадастровый номер** | **Наличие ограничений в использовании** | **Начальная цена, рублей** | **Сумма подлежащих возмещению организатору аукциона расходов на его проведение, рублей** |
| | **1.** | Лынтупский сельисполком, Витебская обл., Поставский р-н, д. Станчики, ул. Тихая, 30 | 0,2460 | 224082827101000040 | водоохранная зона реки Страча | 15 000 000 | 15 627 800 |
| **Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельных участков для проведения аукциона** | - в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола аукциона внести плату за земельный участок и возместить Лынтупскому сельисполкому затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, формирования земельного участка, в т. ч. государственной регистрации в отношении создания земельного участка;<br>- в течение двух месяцев после утверждения протокола аукциона обратиться за государственной регистрацией прав, ограничений прав на земельный участок;<br>- получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство одноквартирного жилого дома;<br>- приступить к занятию земельного участка (начать строительство) в течение одного года после получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации права на него | | | | | | |
| **Порядок осмотра на местности земельного участка** | В рабочие дни с 8.00 до 17.00 по мере обращений лиц, заинтересованных в участии в аукционе. Обращаться в землеустроительную службу Поставского райисполкома г. Поставы, пл. Ленина, 25, здание райисполкома, 1-й этаж, каб. 11, а также в Лынтупский сельисполком, г.п. Лынтупы, ул. Голубкова, 44А | | | | | | |
| **Перечень документов, которые необходимо представить участникам аукциона до его начала** | - заявление на участие в аукционе (бланк можно получить и заполнить непосредственно в землеустроительной службе);<br>- квитанция об уплате задатка;<br>- ксерокопия стр. 25, 31, 32, 33 общегражданского паспорта без нотариального засвидетельствования;<br>- представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность | | | | | | |
| **Место, дата и время начала и окончания приема заявлений** | г. Поставы, пл. Ленина, 25, здание райисполкома, 1-й этаж, каб. №11, в рабочие дни с 8.00 до 17.00 со дня публикации извещения до 26.05.2016 включительно | | | | | | |
| **Размер задатка, срок и порядок его внесения** | 10% от начальной цены участка до подачи заявления на счет Лынтупского сельисполкома. Реквизиты платежа указаны в бланке заявления на участие в аукционе | | | | | | |
| **Адрес и номер контактного телефона комиссии** | г. Поставы, пл. Ленина, 25, здание райисполкома,1-й этаж, каб. №11, в рабочие дни с 8.00 до 17.00 (перерыв на обед с 13.00 до 14.00) телефоны: 8(02155) 43180, 41132 | | | | | | |

**V Усебеларускі народны сход**

# НОВАЯ ФОРМА ПОЛАЦКАГА ВЕЧА

## Беларусы спрадвеку прымалі значныя рашэнні супольна


Фота Надзеі БУЖАН.

**Да тых падзей, якія перыядычна адбываюцца ў краіне, прывыкаеш і ставішся да іх, як да належнага. Парламенцкія выбары — раз на чатыры гады, пасланне Прэзідэнта — штогод, прэзідэнцкія выбары, Усебеларускі народны сход — раз на пяць. Часу нестае, каб задумацца, адкуль растуць іх карані. Але ўсе гэтыя мерапрыемствы, і асабліва Усебеларускі сход, ёсць працяг менталітэту беларусаў, традыцыя вядзення дзяржаўных спраў, якая складалася стагоддзямі. У гэтым перакананы Мікалай СМЯХОВІЧ, загадчык цэнтра новай і найноўшай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук, кандыдат гістарычных навук, дацэнт.**

### Захаванне пераемнасці

— Усебеларускі сход — гэта працяг тых гістарычных традыцый, якія заўжды былі ў беларусаў, — лічыць гісторык. — Улады ў Полацкім княстве, у Вялікім Княстве Літоўскім, савецкай Беларусі і ў сучаснай нашай дзяржаве заўсёды імкнуліся адшукаць формы, якія дазвалялі б народу непасрэдна ўдзельнічаць у прыняцці лёсавызначальных для краіны рашэнняў. З іншага боку, такія сходы былі магчымасцю пачуць думку грамадскасці па дзяржаўных пытаннях вышэйшымі асобамі.

Па словах Мікалая Смяховіча, каштоўнасць народнага сходу якраз у тым, што гэта форма прамой, непасрэднай дэмакратыі, як рэферэндум альбо выбары. Праўда, сход не замацаваны канстытуцыйна. «Гэта як у сям'і: каб параіцца, склікаецца ўвесь род. І нават калі ёсць старэйшыны, запрашаюцца маладыя, каб пачуць адно аднаго. Дык вось, наша беларуская сям'я збіраецца на сход. Для ўлады гэта дадатковы інструмент, каб параіцца з людзьмі», — лічыць загадчык цэнтра.

Сучасны сход захоўвае папярэднія, уласцівыя для такога кшталту пасяджэнняў, традыцыі. Народнае веча, якое ладзілася ў Полацкім княстве, стваралася для таго, каб князі раіліся з народам. Сёння яно ўвасабляецца менавіта ў форме Усебеларускага сходу. З моманту стварэння Полацкага княства прайшло болей за тысячагоддзе, але ж форма народаўладдзя захавалася. «Толькі гэтай традыцыі мы ў сучасных умовах надалі новыя, адпаведна з рэаліямі XXI стагоддзя, сэнс і змест. Але сутнасць яе фактычна ніяк не змянілася», — лічыць Мікалай Смяховіч.

### Па той бок гісторыі

«Беларусы заўсёды ўсе свае пытанні імкнуліся вырашыць калегіяльна. Сход — асноўная форма нашай нацыянальнай адметнасці, адна з рыс менталітэту. Кастусь Каліноўскі казаў, што «мы, мужыкі, толькі грамадою паміж сабою як вырашым, так і будзе». І яму ж належыць фраза: «Урад для народа». Таму ідэя, якая ўвасабляецца ў сходзе, — зарыентаванасць людзей на паляпшэнне іх дабрабыту», — разважае кандыдат гістарычных навук. На яго думку, калісьці палітычная эліта Рэчы Паспалітай не раілася з народам, не цікавілася яго воляй. Рознага кшталту палітычныя групоўкі ваявалі адна з адной, і ў выніку дзяржава знікла. Таму сходы з'яўляюцца гарантам захавання міру і еднасці краіны.

Як прыклад Мікалай Смяховіч прыводзіць гістарычны факт. У 1989 годзе быў скліканы З'езд народных дэпутатаў СССР, у якім узялі ўдзел 2225 чалавек. У верасні 1991 года яны прынялі рашэнне распусціць сход, і ліквідацыя Савецкага Саюза «была наступствам таго, што дэпутаты адмовіліся адказваць за лёс сваёй краіны». «Яны прынялі рашэнне, якое разбурыла савецкую дзяржаву, не выканалі сваёй гістарычнай місіі. Таму сучаснікі мусяць разумець усю адказнасць, якая на іх ускладаецца ўдзелам у сходзе», — упэўнены навуковец.

— У 1990-я гады, калі нарадзілася ідэя склікаць народны сход, думаю, шмат хто памятае, як цяжка даводзілася нашым людзям, якая разруха панавала ва ўсіх галінах жыцця. У тых умовах скліканне сходу дапамагло выратаваць краіну ад таго, каб мы не азлобіліся адно на аднаго, каб розныя сацыяльныя слаі і групы насельніцтва знайшлі згоду паміж сабой і ўладамі. Цяпер наша задача — надзейна захаваць яе, — кажа Мікалай Уладзіміравіч.

### На сваё не наракайце

Па словах вучонага, сход лічыцца дэмакратычнай формай прыняцця рашэння ўладамі. Але эталона дэмакратыі няма. У кожнай краіне яна свая і адпавядае нацыянальным і гістарычным традыцыям, культуры. У Амерыцы, Францыі і Беларусі сістэмы розныя, але кожная з іх мае права на існаванне: «Як мы пра сябе думаем, так і іншыя народы. Яны глядзяць на Беларусь нашымі вачыма. Таму ганьбіць тое, што было створана на роднай зямлі, як мінімум неразумна».

Сход — гэта яшчэ і своеасаблівая форма сабornасці славянскіх народаў. Яна ўласцівая, напрыклад, і расіянам. Калі народ мусіў выбраць манарха, адбываўся ўсенародны сход. Таму такая форма гістарычнай сабornасці калектыўнага прыняцця рашэнняў натуральная, а не штучна створаная. «Таксама ў менталітэце нашага народа імкненне да справядлівасці і роўнасці. Так было заўжды на працягу тысячагадовага існавання беларускай дзяржаўнасці. Няхай мы ўсе будзем жыць бядней, але справядліва. Усебеларускі народны сход гэтую лінію працягвае. Бо раіцца можа толькі роўны з роўным», — падкрэслівае Мікалай Смяховіч.

— На народным сходзе будзе прымацца праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Але я думаю, што варта склікаць сходы не толькі, каб прымаць яе, але і ўвогуле для вызначэння любых значных для дзяржавы пытанняў. Неабавязкова для гэтага ладзіць падобны па форме і змесце рэферэндум, бо яны абодва — прамое волевыяўленне народа. Чаму б не ладзіць сходы часцей і вырашаць на іх, напрыклад, палітычныя пытанні? — задае рытарычнае пытанне пад канец размовы Мікалай Смяховіч.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

# АЛЕЮ ДРУЖБЫ НАРОДАЎ ПАПОЎНЯЦЬ 7 «НАВАСЕЛЬЦАЎ»

**Заключныя мерапрыемствы XI Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур у Гродне адбудуцца не 3-4 чэрвеня, як раней планавалася, а 4-5 чэрвеня. Пры гэтым начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама Аляксандр ВЯРСОЦКІ зазначыў, што ніводная падзея ў сувязі з карэкціроўкай тэрмінаў правядзення свята адменена не будзе.**

**Намеснік старшыні Гродзенскага гарвыканкама Зоя КУЛЕША** паведаміла, што на ўездах у горад і на яго вуліцах установяць каля 50 білбордаў з фотаздымкамі пісьменнікаў, мастакоў, музыкантаў розных нацыянальнасцяў, прычым некаторыя — з цытатамі з іх твораў. Фестывальную сталіцу ўпрыгожаць і лагатыпы свята: сяміколерная кветачка і бусел з... арнаментамі на крылах.

Алея дружбы народаў з 35 дрэў у Каложскім парку, якую ўдзельнікі фестывалю заклалі ў 2014 годзе, папоўніцца «навасельцамі» — іх пасадзяць члены дэлегацыі з ЗША, а таксама прадстаўнікі Нігерыі, Сірыі, Чачні і Шры-Ланкі. Плюс яшчэ два дрэвы ад ААН і ЮНЕСКА, пад чыім патранатам праводзіцца сёлетняе свята нацыянальных культур Беларусі.

**Обязанности руководства аудируемого лица по подготовке бухгалтерской отчетности**
Руководство ЗАСО «КЕНТАВР» несет ответственность за составление и представление бухгалтерской отчетности в соответствии с законодательством Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности и организацию системы внутреннего контроля, необходимой для составления бухгалтерской отчетности, не содержащей существенных искажений, допущенных вследствие недобросовестных действий или ошибок.

**Обязанности аудитора**
Аудитор несет ответственность за выраженное мнение о достоверности бухгалтерской отчетности ЗАСО «КЕНТАВР», основанное на результатах проведенного аудита.
Аудит проведен в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь «Об аудиторской деятельности» и национальных правил аудиторской деятельности. Данные правила обязывают соблюдать нормы профессиональной этики, планировать и проводить аудит таким образом, чтобы обеспечить достаточную уверенность относительно наличия либо отсутствия существенных искажений в представленной бухгалтерской отчетности.
В ходе аудита были выполнены аудиторские процедуры, направленные на получение аудиторских доказательств, подтверждающих значения и раскрытие информации в бухгалтерской отчетности ЗАСО «КЕНТАВР», а также другую раскрытую в ней информацию. Выбор аудиторских процедур осуществлялся на основании профессионального суждения с учетом оценки риска существенного искажения бухгалтерской отчетности в результате ошибок или недобросовестных действий. При оценке риска существенного искажения бухгалтерской отчетности рассматривалась система внутреннего контроля ЗАСО «КЕНТАВР», необходимая для составления бухгалтерской отчетности, не содержащей существенных искажений, с целью планирования аудиторских процедур, соответствующих обстоятельствам аудита, но не с целью выражения мнения относительно эффективности функционирования этой системы.
Аудит также включал оценку применяемой учетной политики, обоснованности учетных оценок и общего содержания бухгалтерской отчетности ЗАСО «КЕНТАВР».
Полагаю, что в ходе аудита были получены достаточные и надлежащие аудиторские доказательства, которые могут являться основанием для выражения аудиторского мнения.

**Аудиторское мнение.**
По моему мнению, бухгалтерская отчетность ЗАСО «КЕНТАВР», подготовленная в соответствии с законодательством Республики Беларусь, достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ЗАСО «КЕНТАВР» на 31 декабря 2015 г., а также финансовые результаты деятельности и изменения финансового положения ЗАСО «КЕНТАВР»» за год, закончившийся на указанную дату.

Аудитор, осуществляющий деятельность в качестве индивидуального предпринимателя: Т.А. Верезубова

«22» февраля 2016 г.

---

ИНКАСС ЭКСПЕРТ

Закрытое акционерное общество
«Небанковская кредитно-финансовая организация
**«ИНКАСС.ЭКСПЕРТ»**

220005, г. Минск, Бульвар им. Мулявина, 6, 501,
тел.: +375 (17) 359 74 88, факс: +375 (17) 328 92 48
inbox.nkfo@incass-expert.by, www.incass-expert.by

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
**на 01 апреля 2016 года**

*(в миллионах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Январь–март |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 476 262 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 2 453 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 31 567 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 4 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 20 251 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | |
| 13 | Прочие активы | 1112 | 28 115 |
| **14** | **ИТОГО активы** | **11** | **558 652** |
| **15** | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | 476 741 |
| 17 | Средства банков | 1202 | |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | 26 791 |
| **23** | **ВСЕГО обязательства** | **120** | **503 532** |
| **24** | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | 37 110 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | |
| 28 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | 18 010 |
| **30** | **ВСЕГО собственный капитал** | **121** | **55 120** |
| **31** | **ИТОГО обязательства и собственный капитал** | **12** | **558 652** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
**за январь–март 2016 года**

*(в миллионах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Январь–март |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 1 524 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 1 524 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 353 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 154 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 199 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | (6) |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 0 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 70 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 68 538 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 46 263 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 32 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 23 890 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 6 437 |
| **17** | **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | **2** | **17 453** |
| 18 | Сведения о прибыли на одну акцию в рублях | | |
| 19 | Базовая прибыль на простую акцию | 22 | |
| 20 | Разводненная прибыль на простую акцию | 23 | |

**Председатель Правления** **А.С.Посканной**
**Главный бухгалтер** **А.Н.Бельник**

ЗАО «Небанковская кредитно-финансовая организация «ИНКАСС.ЭКСПЕРТ» зарегистрировано в Национальном банке Республики Беларусь 27.11.2015 г., регистрационный номер 707. УНП 807000255.

---

## ОБЪЯВЛЕНИЕ ПОВТОРНЫХ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | **Лот № 1. Автомобиль УАЗ 31519, гос. номер 3006АР-2, 2002 года выпуска, стоимостью 28 000 000 белорусских рублей** |
| **Собственник (владелец) имущества** | ОАО «Глубокская птицефабрика» (УНП 300019583) |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | Витебская область, г. Глубокое, пл. 17 Сентября, 14 |
| **Наличие обременений** | нет |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | 13.05.2016 в 14.30 г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого,10/1, каб. 1.4 |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Управление принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома 210015, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого,10/1. Судебный исполнитель Ильющенков Алексей Александрович, тел./факс 8(0212)614018, 8(033)6879145, начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. 80336878807 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | Лицо, желающее принять участие в повторных торгах, до начала повторных торгов обязано:<br>1. Подать письменную заявку на участие в повторных торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 в 200 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 635, УНП 300002505, **не позднее 11.00 12.05.2016.**<br>Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота.<br>В соответствии с частью 3 статьи 401 Хозяйственного процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества. |

■ Ёсць пытанне

# АД ЧАГО ЗАЛЕЖЫЦЬ ПАМЕР ПЕНСІІ?

**У рэдакцыю з пытаннем звярнулася пастаянная чытачка газеты. «Чаму людзі, якія маюць стаж 15 гадоў, атрымліваюць такую ж пенсію, як тыя, што адрабілі 30 гадоў і больш? — падзялілася набалелым Таццяна Уладзіміраўна Мароз з Нясвіжскага раёна. — Гэта ж непавага да чалавека, які аддаў сябе рабоце. Той, хто працаваў даўжэй, менш захаваў сваё здароўе. І падаткаў людзі з 30-гадовым стажам заплацілі больш — чаму ж гэта на памеры пенсіі не адбіваецца?»**

## Калі вам выходзіць на пенсію?

| Год | Пол | Пенсійны ўзрост | Дата нараджэння | Права на пенсію ўзнікае | Перыяд для звароту за пенсіяй | Страхавы стаж, неабходны для прызначэння пенсіі | За колькі гадоў працы перад прызначэннем пенсіі вылічаецца заробак |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1-я палова года — з 1 студзеня па 30 чэрвеня, 2-я палова года — з 1 ліпеня па 31 снежня | | | | | | | |
| 2017 | М | 60 гадоў 6 мес. | 1 палова 1957 г. | 2 палова 2017 г. | 2 палова 2017 г. | 16 гадоў | 23 |
| | Ж | 55 гадоў 6 мес. | 1 палова 1962 г. | | | | |
| 2018 | М | 61 год | 2 палова 1957 г. | 2 палова 2018 г. | 2 палова 2018 г. | 16 гадоў 6 мес. | 24 |
| | Ж | 56 гадоў | 2 палова 1962 г. | | | | |
| 2019 | М | 61 год 6 мес. | 1 палова 1958 г. | 2 палова 2019 г. | 2 палова 2019 г. | 17 гадоў | 25 |
| | Ж | 56 гадоў 6 мес. | 1 палова 1963 г. | | | | |
| 2020 | М | 62 гады | 2 палова 1958 г. | 2 палова 2020 г. | 2 палова 2020 г. | 17 гадоў 6 мес. | 26 |
| | Ж | 57 гадоў | 2 палова 1963 г. | | | | |
| 2021 | М | 62 гады 6 мес. | 1 палова 1959 г. | 2 палова 2021 г. | 2 палова 2021 г. | 18 гадоў | 27 |
| | Ж | 57 гадоў 6 мес. | 1 палова 1964 г. | | | | |
| 2022 | М | 63 гады | 2 палова 1959 г. | 2 палова 2022 г. | 2 палова 2022 г. | 18 гадоў 6 мес. | 28 |
| | Ж | 58 гадоў | 2 палова 1964 г. | | | | |
| 2023 | М | 63 гады | 1960 г. | 2023 г. | 2023 г. | 19 гадоў | 29 |
| | Ж | 58 гадоў | 1965 г. | | | | |
| 2024 | М | 63 гады | 1961 г. | 2024 г. | 2024 г. | 19 гадоў 6 мес. | 30 |
| | Ж | 58 гадоў | 1966 г. | | | | |
| 2025 | М | 63 гады | 1962 г. | 2025 г. | 2025 г. | 20 гадоў | 31 |
| | Ж | 58 гадоў | 1967 г. | | | | |

Спецыялісты Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, якіх мы папрасілі пракаментаваць сітуацыю, патлумачылі, што на памер пенсіі, апроч стажу, уплывае яшчэ велічыня заробку. Але гэта не значыць, што пажылыя з доўгай працоўнай гісторыяй застаюцца без падтрымкі.

— Пры роўным прыбытку, але розным стажы пенсіі не будуць аднолькавымі. Напрыклад, пры індывідуальным каэфіцыенце заробку, роўным 1,0, пенсія пры стажы 15 гадоў складае 1 мільён 625,5 тысячы рублёў, а пры стажы 30 гадоў — 2 мільёны 561,4 тысячы, — прыводзяць прыклад у ведамстве. — Разам з тым адзначым, што ў 2016 годзе пенсія на агульных падставах можа быць прызначана, толькі калі маецца не менш за 15 гадоў 6 месяцаў з выплатай абавязковых страхавых узносаў.

Таццяна Уладзіміраўна папрасіла таксама змясціць падрабязную інфармацыю пра тое, хто ў якім годзе зможа выйсці на пенсію па новых правілах. «Мы ў вёсцы інтэрнэтам не карыстаемся. Чакаем «Звязду», каб пра ўсё даведацца», — патлумачыла чытачка.

***Для ўсіх, чый выхад на пенсію прыпадае на пераходны перыяд рэформы, прыводзім графік, складзены Мінпрацы і сацабароны. Звярніце ўвагу: важныя не толькі дата вашага нараджэння, але і час звароту па выплаты па ўзросце, і мінімальны страхавы стаж, які з гэтага года паступова павялічваецца.***

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

# Бізнес, карысны грамадству

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Прынята думаць, што сацыяльнае прадпрыемства — тое, дзе працуюць інваліды. У выпадку з нашай краінай гэты стэрэатып цалкам апраўданы: большасць падобных арганізацый забяспечвае месцамі людзей, якія з пэўных прычын менш канкурэнтаздольныя на рынку працы. Аднак праблемы, якія вырашаюць неабыякавыя бізнесмены, могуць быць самымі living рознымі. Так, у суседняй Расіі 41 працэнт сацыяльных прадпрыемстваў — гэта ўстановы дашкольнай адукацыі. Перспектыўны напрамак таксама цэнтры для пажылых.

— ААН лічыць, што насельніцтва старэе, калі ў ім больш за 7 працэнтаў людзей, старэйшых за 65 гадоў. У Расіі такіх ужо 13 працэнтаў (у Беларусі амаль столькі ж. — **Н.Л.**). У нас у некаторых рэгіёнах на аднаго работніка прыпадае два пенсіянеры. Таму інтэрнаты для пажылых вельмі запатрабаваныя, — акрэслівае сітуацыю **эксперт расійскага фонду «Наша будучыня» Ганна БРУСНІЦЫНА.**

У Санкт-Пецярбургу, напрыклад, працуе прыватны рэабілітацыйны цэнтр «Апека». Пражыванне там каштуе (у пераліку на беларускія грошы) каля 15 мільёнаў рублёў у месяц, са спецыяльным харчаваннем — яшчэ больш. І, нягледзячы на такія расцэнкі, установа карыстаецца папулярнасцю.

## Франшыза на дзіцячы садок

Любая сацыяльная ідэя можа прыносіць грошы. Той жа воркаўт (вулічныя спартыўныя пляцоўкі), які ў нас будуецца за добраахвотныя ахвяраванні і не акупляецца, рэальна манетызаваць — прадаваць пальчаткі, футболкі, патэнты на абсталяванне. А фірма, якая танна абслугоўвае маламаёмных грамадзян, можа пакрываць выдаткі за кошт продажу гэтых жа паслуг па звычайным цэнніку іншым катэгорыям.

За мяжой многія сацыяльныя прадпрымальнікі, стаўшы паспяховымі, пачынаюць прадаваць франшызу на свой бізнес. Так зрабіла брытанская кампанія, што займаецца пераабсталяваннем аўтамабіляў для людзей з інваліднасцю. Сетка фірмаў па ўсёй Англіі дала ёй магчымасць актыўна супрацоўнічаць з лідарамі аўтапрамысловасці і закупляць машыны па больш прывабных коштах. Дый прадаваць спецыялізаваную тэхніку цяпер можна шырокаму колу асоб.

— Часта сетка пераўзыходзіць па сваіх характарыстыках асобныя прадпрыемствы, напрыклад, за кошт эканоміі эфектам маштабу. Плюс партнёры лепш ведаюць мясцовы рынак і могуць працаваць больш эфектыўна, чым наёмныя работнікі, — кажа **старшыня асацыяцыі «Белфранчайзінг» Вольга ЛЯВОНЦЬЕВА** і дадае, што франшыза — добры варыянт для сацыяльных прадпрымальнікаў-пачаткоўцаў: — Гэта тыражаванне не ідэі, а паспяховага бізнес-вопыту. Больш правільна не выдумляць новае, калі ты працуеш у адным напрамку, а ўзяць праверaную мадэль і стаць не канкурэнтамі, а партнёрамі. Франшыза дае падтрымку ад галаўной кампаніі, магчымасць даволі хутка рэалізоўваць праекты. Гэта дакладныя інструкцыі па запуску і вядзенні бізнесу.

У Расіі сацыяльныя франшызы ўжо таксама ёсць. Адна з самых частых — на дзіцячы садок. Добра тыражуюцца дзіцячыя аздараўленчыя цэнтры, маладзёжныя гасцініцы. Вось, напрыклад, франшыза, якую прапануе хостэл «Дастаеўскі». Першапачатковая інвестыцыя — паўмільёна рублёў (на нашы — 146 мільёнаў). Гэта няшмат, у сярэднім для расійскага стартапа патрабуецца мільён-паўтара. Шэсць месяцаў тэрмін акупнасці, што вельмі хутка, і пяць працэнтаў роялці (звычайна адлічэнні галаўной кампаніі складаюць 7-10 працэнтаў). Цалкам даступныя ўмовы для бізнесменаў, якім важны не толькі прыбытак.

## Спроба разбагацець на праблемах?

Бадай, галоўны бар'ер для сацыяльных прадпрымальнікаў у нашай краіне — адсутнасць у заканадаўстве асаблівых умоў для такога бізнесу. У выніку падобныя фірмы вымушаны канкурыраваць з буйнымі кампаніямі, дзе сабекошт прадукцыі ніжэйшы і ім складана прабівацца ў гандлёвыя сеткі.

Ёсць пэўныя праблемы з продажам і маркетынгам.

— Нашы сацыяльныя прадпрыемствы, як правіла, узначальваюць наёмныя кіраўнікі, якія часта не аналізуюць рыначны стан сваёй кампаніі. Толькі невялікая частка задумваецца пра распрацоўку стратэгіі развіцця, — адзначае **Аксана ЕРАФЕЕВА, загадчыца кафедры эканомікі Інстытута бізнесу і менеджменту тэхналогій БДУ.**

**Даследчыца Марыя ЧАРАКОВА** заўважае, што ў сацыяльных арганізацый мала кантактаў з астатнім бізнесам. Прадпрымальнікі прызнаюцца, што спрабуюць наладзіць супрацоўніцтва, але вялікія кампаніі не зацікаўлены ў партнёрстве з імі.

Дзіўна, што айчынныя бізнесмены не вымяраюць сацыяльны эфект сваёй дзейнасці. Хоць зрабіць гэта проста: падлічыць, на колькіх людзей вы паўплывалі ці як скарацілі выкід шкодных рэчываў у наваколле. Многія ўвогуле не пазіцыянуюць сваё прадпрыемства як сацыяльнае, бо лічаць, што гэта можа пагоршыць імідж. (І, на жаль, маюць рацыю. Распаўсюджаны стэрэатып, што падобныя кампаніі спрабуюць разбагацець на людзях з асаблівасцямі і праблемах іншых.) У выніку спажывец выбірае прадукцыю без уліку таго, што яе выпускае сацыяльнае прадпрыемства.

Капіраваць замежны вопыт у гэтай сферы не так проста, як здаецца.

— Мы праводзілі вялікае даследаванне па рынках ЗША, Вялікабрытаніі і Польшчы, — распавядае Ганна Брусніцына. — Але прыйшлі да разумення, што наш менталітэт моцна адрозніваецца ад еўрапейскага. І калі бяром замежныя напрацоўкі, даводзіцца іх шмат перарабляць пад нашы рэаліі. У нас іншыя людзі, іншыя задачы, іншыя магчымасці дзяржавы. У Еўропе 90 працэнтаў капіталу сацыяльных прадпрыемстваў — інвестыцыі дзяржавы. Нашы ж бізнесмены могуць разлічваць максімум на працэнтаў 20-25.

Вядома, сацыяльныя праекты можна рэалізоўваць за кошт грантаў і добраахвотных ахвяраванняў. Аднак такі спосаб не самы надзейны: грошы могуць скончыцца раней, чым будуць атрыманы новыя. Ускладаць усё на бюджэт таксама не лепшы варыянт.

— Дзяржава цягне на сабе вельмі шмат сацыяльных функцый, — лічыць эксперт фонду «Наша будучыня». — І ў выніку пэўных фінансавых цяжкасцяў — і ў нашай, і ў вашай краіне — складана несці такую нагрузку. Гэта велізарны клубок праблем, з якімі дзяржава ўжо не спраўляецца. Таму сацыяльнае прадпрымальніцтва можа ўзяць частку праблем на сябе. Няхай гэта будзе платнае рашэнне, але яно будзе.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

# НЯСВІЖ АТРЫМАЕ ЭЛЕКТРОБУС

**4 мая адбудзецца перадача першага электробуса, набытага для развіцця турызму на тэрыторыі палаца-паркавага комплексу Радзівілаў.**

«Зялёны» транспарт набыты ў межах праекта «Садзейнічанне пераходу Рэспублікі Беларусь да «зялёнай» эканомікі» (фінансуецца Еўрапейскім саюзам і рэалізуецца Праграмай развіцця ААН). У той жа дзень у Нясвіжы будзе праходзіць і семінар на тэму ўкаранення ў краіне экалагічных інавацый. Летась Беларусь узяла на сябе абавязкі па рэалізацыі мэтаў устойлівага развіцця, сярод якіх і спыненне змены клімату. Адсюль імкненне да таго, каб не перавышаць аб'ём выкідаў парніковых газаў. У 2009—2013 гадах выкіды ад транспартнага сектара скараціліся на 21 працэнт, нягледзячы на павелічэнне на 15 працэнтаў колькасці транспартных сродкаў, на 16 працэнтаў — спажывання вадкага паліва і на 77 працэнтаў — газападобнага паліва.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*


**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| ЛОТ 1 | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | - капитальное строение, инв. № 451/С-228 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – здание АБК), площадью 148,1 кв.м, расположенное по адресу: Новоельнянский с/с, г.п. Новоельня, ул. Заводская, д. 2. Составные части и принадлежности: электрическая сеть, водопроводная сеть, канализационная сеть.<br>- капитальное строение, инв. № 451/С-231 (назначение – здание специализированное коммунального хозяйства, наименование – котельная), площадью 339,3 кв.м, расположенное по адресу: Новоельнянский с/с, г.п. Новоельня, ул. Заводская, д. 2.<br>- капитальное строение, инв. № 451/С-230 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – компрессорная), площадью 67,2 кв.м, расположенное по адресу: Новоельнянский с/с, г.п. Новоельня, ул. Заводская, д. 2.<br>- капитальное строение, инв. № 451/С-226 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – трансформаторная подстанция), площадью 46,6 кв.м с трансформатором ТМ-400/10/0,4, расположенное по адресу: Новоельнянский с/с, г.п. Новоельня, ул. Заводская, д. 2, корп. 3.<br>- капитальное строение, инв. № 451/С-14167 (назначение – сооружение специализированное железнодорожного транспорта, наименование – внутриплощадочный ж/д путь), площадью 420,2 кв.м, расположенное по адресу: Новоельнянский с/с, г.п. Новоедьня, ул. Заводская, д. 2. Составные части и принадлежности: линейная часть подъездного железнодорожного пути, стрелочный перевод, железнодорожный переезд |
| Земельный участок, на котором расположен объект | - кадастровый номер 422356300002000075 (назначение – размещение промышленных объектов), площадью 3,3565 га, расположенном по адресу: Новоельнянский с/с, г.п. Новоельня, ул. Заводская, д. 2. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные учаски, расположенные в охранных зонах линий электропередачи, площадью 0,051 га.<br>- кадастровый номер 422356300002000753 (назначение – земельный участок для размещения объектов железнодорожного транспорта), площадью 0,0119 га, расположенном по адресу: Новоельнянский с/с, г.п. Новоельня, ул. Заводская, д. 2/1 |
| Начальная цена продажи | 508 514 160 (пятьсот восемь миллионов пятьсот четырнадцать тысяч сто шестьдесят) белорусских рублей с учетом НДС |
| Сумма задатка | 25 425 708 (двадцать пять миллионов четыреста двадцать пять тысяч семьсот восемь) белорусских рублей |
| Продавец | ОАО «Дорожно-строительный трест № 6», 230026, г. Гродно, ул. Победы, 13, Тел. 54-31-08, факс 8-017-210-84-14 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32 |
| Условия аукциона | Возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведение аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 3% от конечной цены продажи объекта |
| Условия оплаты | По договоренности сторон |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 26 мая 2016 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 25.08.2015 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 23 мая 2016 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by/**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

**Сядзі і глядзі**

# Падводныя камяні сямейнага падарожжа

## Праграма «Дзіцячы доктар» тэлеканала «Беларусь 1» збірае ў студыі і каля экранаў бацькоў і дзяцей

**Тут кожны можа атрымаць карысную і кампетэнтную інфармацыю ад вядучых праграмы (педыятраў) і экспертаў у той ці іншай тэме. Нядаўна мы завіталі на здымачную пляцоўку праекта, каб даведацца, што адбываецца па той бок экрана.**

Трапілі якраз на здымкі спецыяльнага юбілейнага (50-га) выпуску праграмы. У эфіры ён з'явіцца 6 мая, напярэдадні Дня радыё, тэлебачання і сувязі. І таму на гэты раз у студыі сярод мам і татаў аказаліся вядомыя тэлевядучыя і журналісты, якія, нягледзячы на сваю пастаянную занятасць, для сваіх сыноў і дачок у першую чаргу — клапатлівыя бацькі.

Вядучыя перадачы, педыятры з вялікім вопытам — Дзмітрый Часноў, Валерый Андрыенка і Вольга Кардаш — сваімі прафесійнымі і чалавечымі якасцямі здольны не толькі завабіць увагу тэлевізійнай аўдыторыі, але і тых, хто знаходзіцца з імі на адной пляцоўцы. Напрыклад, Дзмітрый Часноў прызнаўся, што гэта яго першы вялікі вопыт працы на тэлебачанні, бо раней даводзілася бываць у кадры хіба толькі ў ролі госця ці эксперта. Цяпер жа ён лёгка і камфортна адчувае сябе ў ролі мадэратара на здымачнай пляцоўцы. Паспявае не толькі дзяліцца карыснай інфармацыяй, але і за дзецьмі запрошаных бацькоў сачыць краем вока, бо тых жа толькі і пільнуй!

На здымках чарговай праграмы, якая была прысвечана тэме «Вандроўка з дзецьмі» гасцямі сталі Вольга Шлягер з сынам Георгіем, Аляксандра Снегіна з сынамі Артурам і Муратам, Вольга Плотнікава з дачкой Алінай і сынам Данікам, Руслан Туркоў з двайнятамі Янінай і Раманам, Юлія Пярцова з дачкой Лізаветай, а таксама Аляксандр Смірноў з жонкай і дочкамі Марынай і Марыяй. Тэлебацькі актыўна папаўнялі сваю скарбонку ведаў, дзяліліся вопытам і задавалі пытанні экспертам.

Аднак пра ўсё па парадку... Канец вясны і лета — гэта самы актыўны час, калі бацькі задумваюцца пра аздараўленне сваіх малых і плануюць розныя вандроўкі з імі. Сёння існуе шмат варыянтаў, куды і як паехаць на пікнік на выхадных ці ў адпачынак на больш працяглы час усёй сям'ёй. І, пабываўшы на здымачнай пляцоўцы «Дзіцячага доктара», мы даведаліся, на што варта звярнуць увагу, калі збіраецеся ў падарожжа. Перш за ўсё, неабходна ўдзяліць увагу бяспецы. Так у першым блоку здымак «зорныя» таты і мамы выбіралі аўтакрэсла для дзіцяці. Аднак, перш чым запрасіць эксперта ў студыю, які дапаможа з выбарам, вядучы Дзмітрый Часноў звярнуўся да бацькоў:

— Што самае важнае трэба ўзяць з сабой, калі вы збіраецеся падарожнічаць з сям'ёй?

— Дзяцей! — адказаў з гумарам адзін з бацькоў.

— Правільна, — падтрымаў вядучы. — Але пры гэтым важна паклапаціцца пра іх бяспеку, здаровае харчаванне і не забыць прыхапіць з сабой аптэчку.

Калі казаць пра аўтакрэсла, то, думаю, усім бацькам вядома, што сёння існуе мноства марак і мадэляў гэтага тавару. І таму пытанне нумар адзін — як не разгубіцца ў свеце шматлікіх прапаноў. Галоўнае, ні ў якім разе не адмаўляцца ад яго, бо, аказваецца, калі аўто едзе, а потым рэзка тармозіць, то вага чалавека павялічваецца ў 33 разы. Уявіце толькі, што можа пагражаць вашым сыну ці дачцэ ў выпадку дарожнага здарэння. Як правільна выбраць аўтакрэсла, замацаваць яго ў вашым аўто і многія іншыя моманты агучаць і прадэманструюць у праграме.



Спявачка і тэлевядучая Вольга ПЛОТНІКАВА выбірае для дачкі толькі карысныя прадукты.




Выбар аўтакрэсла для дзіцяці — адзін з найважнейшых пунктаў камфортнага падарожжа.

А цяпер больш падрабязна спынімся на леках, якія варта ўзяць у дарогу, і ежу, што як дзіцячаму, так і даросламу арганізму заўсёды неабходная. Запрасіўшы да сябе ў асістэнты Вольгу Шлягер і яе сына Георгія наш вядучы пачаў распытвацца, што ж неабходна ўзяць з сабой.

— Выбар тых альбо іншых лекавых сродкаў залежыць ад узросту дзіцяці. У нас, напрыклад, па меры таго, як сын падрастае, аптэчка меншае, — адзначыла Вольга. — Увогуле, думаю, трэба, каб там былі сродкі ад атручванняў, драпін, укусаў камароў, перакіс вадароду, бінт, марля.

З выбарам мамы доктар згадзіўся і расказаў пра адну цікавую навінку — вугляродныя сурвэткі. Рэч вельмі карысная і простая ў выкарыстанні. Такая сурвэтка стэрыльная і з'яўляецца сродкам дэзынфекцыі, які спрыяе хуткаму загойванню ран без рубцоў. Дастаткова прыкласці яе да пашкоджанага месца на целе, пакрыць марляй і зафіксаваць лейкапластырам альбо бінтам. Добры варыянт аказання хуткай дапамогі ў дарозе!..

А вось каб пазбегнуць непрыемнасцяў з харчовымі атручваннямі, варта вельмі адказна паставіцца да таго, якія прадукты вы возьмеце для перакусаў. І пакуль дзятва малюе, гуляе, іх таты і мамы працягваюць папаўняць свой багаж ведаў. Цяпер доктару дапамаглі ў зборах Вольга Плотнікава і яе дачка Аліна.

— Мне часта даводзіцца быць з дзіцем у дарозе, і да пытанняў харчавання мы ставімся вельмі адказна. Напрыклад, дзеці любяць чыпсы, газіроўку і шмат іншых прадуктаў, але ў нас яны знаходзяцца пад забаронай, — дзеліцца вопытам Вольга. — Збіраючыся ў дарогу, мы найперш думаем пра ваду; можам узяць і сок для разнастайнасці, а з прадуктаў аддаём перавагу свежай садавіне.

Калі дачушцы Вольгі вядучы прапанаваў адказаць на некалькі пытанняў віктарыны, то яна амаль без сумнення выбрала для вандроўкі пітную ваду замест газіроўкі, сухое пячэнне замест пірожных і тую самую свежую садавіну, а не пюрэ ў слоічках... Тым самым прадэманстравала засвоеную маміну навуку.

У канцы з малымі па традыцыі правялі гімнастыку, якая, дапамагла не толькі пераключыць увагу дзяцей, але і стала своеасаблівым майстар-класам для бацькоў.

Усіх сакрэтаў таго, што нам удалося пабачыць на здымках «Дзіцячага доктара», не будзем раскрываць, бо лепш адзін раз убачыць сімім, чым шмат разоў пачуць. Пачынайце глядзець праграму ўжо зараз, бо ў кожным яе выпуску вас абавязкова чакае карысная інфармацыя.

**Алена ДРАПКО.**
*drapko@zviazda.by*

# ДЫНАМІКА І ДУШЭЎНАСЦЬ

## «ХАЧУ, КАБ НАШ ПРАЕКТ СТАЎ ДОЎГАЖЫХАРОМ НА ТЭЛЕБАЧАННІ»



**Баскетбол — адзін з самых папулярных, даступных відаў спорту. Нарэшце ў яго з'явілася сваё прадстаўніцтва на беларускім тэлебачанні. І цяпер кожны тыдзень на тэлеканале «Беларусь 5» у эфір выходзіць праграма «Слэм-данк». Аб тым, як нарадзілася ідэя стварыць падобны праект, якія творчыя планы ў яго каманды, ці запатрабаваны гэты тэлепрадукт, мы даведаліся ў Антона МЕЛЕШАВА, аўтара і аднаго са стваральнікаў праграмы.**

— Рэч у тым, што на нашым канале тэлепраграмы пра такія віды спорту, як футбол, хакей, ужо створаны. Але валейбол і баскетбол былі незакранутыя. І праграму, прысвечаную баскетболу, дарučылі рыхтаваць мне, — кажа наш суразмоўца. — Выбары назвы былі пакутлівымі. Было шмат версій. Лагічна, каб праграма, якая выходзіць па серадах, называлася «Баскетбольная серада», але праект з такой назвай для Сталічнага тэлебачання ўжо калісьці рабіў Мікалай Хадасевіч. Былі яшчэ назвы «Шчыт і мяч», «Баскет-тайм», «Аранжавы апельсін». Шляхам галасавання і з дапамогай парады аўтарытэтных асоб мы спыніліся на «Слэм-данку».

***— Ты займаўся ў баскетбольнай секцыі?***

— Не, толькі гуляў крыху ў школе на занятках па фізкультуры. Але спорт ідзе са мной па жыцці. Я пастаянна займаўся рознымі відамі спорту. Нядаўна, напрыклад, адкрыў для сябе гандбол — гуляю за зборную беларускіх журналістаў. А што тычыцца баскетбола, каманда нашага канала нядаўна атрымала перамогу ў адным з этапаў спартакіяды Белтэлерадыёкампаніі. Я стараюся не спыняцца на месцы і даведвацца нешта новае пра баскетбол кожны дзень. Дзякуй за дапамогу журналісту Дзмітрыю Герчыкаву, экс-гульцу нашай зборнай, каментатару Аляксею Пынцікаву, якія дапамагаюць яшчэ лепш спазнаць гэтую гульню.

***— А ў журналістыцы якім чынам апынуўся?***

— У дзяцінстве я вельмі любіў чытаць і глядзець дэтэктывы. Мне хацелася стаць сышчыкам альбо дэтэктывам, атрымаць юрыдычную адукацыю. Але ў старшых класах ужо дакладна ведаў, што хачу на працы кантактаваць з людзьмі, займацца творчасцю. Маці казала, што ў мяне нядрэнна атрымліваецца выкладаць свае думкі. У выніку пасля заканчэння аддзялення журналістыкі Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Аркадзя Куляшова я пайшоў працаваць на магілёўскі Другі канал. Здымаў сюжэты, пісаў навіны пра спорт і розныя сацыяльныя тэмы. Ужо пасля прыйшоў працаваць на Белтэлерадыёкампанію — на канал «Беларусь-5».

***— «Слэм-данк» — пра што гэты праект?***

— Гэта сімбіёз дынамікі і душэўнасці. Мы расказваем пра выступленне мінскіх «Цмокаў», чэмпіянат Беларусі, жаночую і мужчынскую зборную Беларусі. Не можам не закрануць міжнародныя падзеі — матчы Еўралігі і НБА ў Паўночнай Амерыцы. Але ўпор робім і на іншае. Мы стараемся паказаць не толькі тое, як баскетбалісты кладуць мяч у кошык. У межах рубрыкі «Партрэт» робім душэўныя інтэрв'ю. Нашымі героямі былі вядомыя ў баскетбольным асяродку людзі: Аляксандр Круцікаў і Таццяна Лавец, Наталля Трафімава і літоўская легіянерка жаночай каманды «Цмокаў» Гедрэ Паўгайтэ... Дарэчы, Гедрэ выдатна малюе. І робіць гэта ледзь не на прафесійным узроўні. Яе працы могуць скласці цэлую выставу. У планах — размовы з ветэранамі нашага баскетбола, гульцамі маладзёжнай зборнай, якая ў 1994 годзе стала чэмпіёнам Еўропы. Наогул у сваёй працы імкнёмся да таго, каб праект стаў доўгажыхаром на тэлебачанні. Быў якасным, запатрабаваным прадуктам. Каб кожны чалавек заўжды знаходзіў у праграме тое, што яго цікавіць.

***— З-за цяперашняй спецыялізацыі цябе на тэлебачанні баскетбалістам не называюць?***

— На нашым 11-м паверсе яны ўжо перасталі мяне бачыць. Я альбо на здымках, альбо ў «мантажцы». І кантактаваць з імі не заўжды атрымліваецца. А наконт мянушкі ёсць іншы прыклад. У нашых «Цмокаў» быў вельмі складаны перыяд. І пасля таго, як у трэнера каманды я спытаў, ці не запрасіць ім чараўніка, мяне так і празвалі — чараўніком, шаманам.

***— Ці ёсць у праграмы водгук ад гледачоў?***

— Мне часам пішуць у «Вконтакте» і ў «Фэйсбуку». Многія дзякуюць за праграму, зычаць поспехаў. Я наогул за канструктыўны дыялог. А таму, калі камусьці ёсць што прапанаваць, выказацца, падзяліцца меркаваннямі, пішыце. Буду рады пагутарыць з кожным.

**Тарас ШЧЫРЫ.**
*taras@zviazda.by*

## Аўторак, 3 мая

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.25** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.45** Зона Х.
**9.10, 22.00 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**10.55, 15.25 Серыял «Дом з лілеямі».**
**12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.15** Дзень у вялікім горадзе.
**14.20** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 0.05** Сфера інтарэсаў.
**20.00 Баявік «Дыверсант. Канец вайны».**
**21.00** Панарама.
**21.45** Спецыяльны рэпартаж.
**0.45** Дзень спорту.
**0.55 Серыял «Цікаўная Варвара 2».**

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.05** Тэлебарометр.
**9.05, 16.15 Трылер «Закрытая школа».**
**10.10** «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**11.15 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**13.10, 17.25 Серыял «Сакрэтны фарватар».**
**14.30** «Арол і рэшка. Шопінг». Трэвел-шоу.
**15.30** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**18.55** «Бітва экстрасэнсаў. Барацьба кантынентаў».
**21.10** «Рыжыя». Скетчкам.
**21.30** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**21.45** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Паўфінал. Матч у адказ. Баварыя — Атлетыка.
**23.45 Серыял «Быць чалавекам».**

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 13.55, 18.35, 21.00** «Калейдаскоп».
**7.50, 18.45** «Размаўляем пабеларуску». Тэлевіктарына.
**8.00, 19.30 «Цішыня». Драма. Фільм першы.**
**9.05** «Грані Перамогі». Салдаты Перамогі.
**9.35 «Камуніст». Драма.**
**11.20** «Жывая вада». Дак. фільм.
**11.35 «Рыфмуецца з каханнем». Меладрама.**
**13.20** «Святло далёкай зоркі». Памяці кінарэжысёра Леаніда Нячаева.
**14.05 «Цімур і яго каманда». Прыгоды.**
**15.25** «За ўсё дзякую!» Юбілейны канцэрт Сяргея Захарава.
**16.30** «Час кіно».
**16.35 «Белыя росы». Камедыя.**



**18.05, 23.25** «Дыя@блог». Пра вечнае.
**18.50, 21.15** «Вялікая Айчынная. Недагаворанае. Дзяцінства, апаленае вайной.
**20.40** «Калыханка».
**21.55 «Дабравольцы». Драма.**

### Беларусь 5

**7.10** PRO спорт. Вынікі.
**7.35, 13.00, 21.00, 22.55** Тэніс. Турнір WTA. Мадрыд.
**9.30** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Чэлсі» — «Тотэнхэм».
**11.20** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**12.15** Час футбола.
**18.55** Спорт-кадр.
**19.25, 22.45** PRO спорт. Навіны.
**19.30** Муай-тай і К-1. Міжнародны прафесіянальны турнір.
**20.30** «Місія — Рыа». Відэачасопіс.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05 Маст. фільм «Зімовая вішня».**



**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10 Камедыя «Брыльянтавая рука».**
**13.10, 16.20 Серыял «Часова недаступны».**
**17.35, 18.20** Цырымонія ўручэння народнай прэміі «Залаты грамафон».
**21.05 Драма «Чорны лебедзь».**
**23.00 Баявік «Каманда-А».**
**1.00** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.40** «Тайны Чапман».
**9.20, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.10** «Далёкія сваякі».
**10.40** «Сямейныя драмы».
**11.35** «Не хлусі мне!»
**12.35, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50 Маст. фільм «Пасланне ў бутэльцы».**
**16.05** «Вадзіць па-руску».
**16.50** «Цэнтральны рэгіён».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Тэрыторыя памылак».
**22.00** «Глядзець усім!»
**23.00** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**23.20** «Аўтапанарама».
**0.30 «Сямнаццаць імгненняў вясны». Серыял.**

### МІР

**6.00** М/ф.
**7.40 Маст. фільм «Як прышыць сваю жоначку».**
**10.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15 Маст. фільм «Жорсткі раманс».**
**12.55** «Цяжар абеду».
**13.25 Маст. фільм «Нявеста, якая ўцякла».**
**16.15, 19.15 Серыял «Сінія ночы».**
**22.05 Маст. фільм «Ліхтугі кітайца ў Кітаі».**
**0.05 Маст. фільм «Дванаццаць крэслаў».**
**3.00 Маст. фільм «Сабрына».**
**5.05** Дак. фільм «З нагоды».

### РТР—Беларусь

**7.00 Маст. фільм «Здабытак рэспублікі».**
**9.20 Маст. фільм «Каханне нечаканае наляціць».**
**12.30** «Не толькі пра каханне». Канцэрт Мікалая Баскава.
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.00, 20.00** Весткі.
**14.15, 17.00, 20.35 Маст. фільм «Скалалазка».**
**21.45, 23.10 Серыял «Сысці, каб вярнуцца».**
**0.15 Маст. фільм «Гэта мой сабака».**

### НТБ—Беларусь

**6.15** «Астрапрагноз».
**6.20 Серыял «Сужэнцы».**
**8.00, 10.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.20 Музычны фільм «Галасы вялікай краіны».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20, 16.20 Серыял «Сёмін. Адплата».**
**17.15, 19.20 Серыял «Мянтоўскія войны».**
**22.55** «Жадаю табе». Юбілейны канцэрт Ігара Саруханава.
**0.50** «Чырвоны Вялікдзень».

### 8 канал

**7.00, 14.50, 20.00, 21.05, 23.45** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.30, 20.05 Серыял «Тыран».**
**8.20, 18.45 Серыял «Абараніць боса».**
**9.25 Серыял «І нікога не стала», 1-я серыя.**
**10.20, 12.55, 14.35, 15.45, 16.45, 18.40, 19.50, 21.00** «Хатняя крама».
**10.30** «Мой любімы гадаванец».
**11.00 Драма «Схватка».**
**13.00 Серыял «Пуаро Агаты Крысці».**
**14.55 Серыял «Нашчадкі».**
**16.30** «Кінаблакнот».
**17.00 Серыял «Усё спачатку».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.10** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.20 Трылер «Каралева праклятых».**
**23.00 Серыял «Штам».**

# ЧЭМПІЯНАТ СВЕТУ ПА ХАКЕІ — 2016:

## Трансляцыі адразу на трох тэлеканалах

**З 6 па 22 мая ў Маскве і Санкт-Пецярбургу пройдзе чэмпіянат свету па хакеі, для трансляцыі якога да спартыўнага тэлеканала медыяхолдынга «Беларусь 5» далучацца «Беларусь 1» і «Беларусь 2».**



Зборнай Беларусі на чэмпіянаце свету ў Расіі ў групавым раўндзе трэба будзе пазмагацца з нацыянальнымі камандамі Канады, Фінляндыі, ЗША, Славакіі, Францыі, Германіі і Венгрыі. Гэтая група згуляе ў Санкт-Пецярбургу, які ўжо другі раз прымае чэмпіянат свету па хакеі.

Усе матчы беларускай зборнай на стадыі групавога раўнда і ў выпадку выхаду ў плэй-оф будзе трансляваць тэлеканал «Беларусь 1».

Таксама на час чэмпіянату на галоўным тэлеканале краіны кожны вечар можна будзе ўбачыць падрабязны агляд матчаў па слядах гульняў, якія прайшлі.

Маладзёжны тэлеканал «Беларусь 2» прадставіць увазе тэлегледачоў гульні гаспадароў першынства — зборнай Расіі.

Матчы трыумфатара чэмпіянату свету ў Мінску, як правіла, заўсёды выклікаюць вялікую цікавасць у беларускай публікі. Таму Белтэлерадыёкампанія вырашыла зрабіць падарунак аматарам хакея і ў поўным аб'ёме прадставіць цяперашні турнір.

У эфіры тэлеканала «Беларусь 5» можна будзе сачыць і за ўсімі астатнімі матчамі чэмпіянату.

— Паколькі час пачатку гульняў у Маскве і Санкт-Пецярбургу будзе супадаць, то частку матчаў, вядома, мы пакажам у запісе, але прыярытэт прамых трансляцый галоўнага хакейнага турніру года бясспрэчны. Агляды матчаў будуць таксама выходзіць на тэлеканале «Беларусь 5». Акрамя гэтага, з'явяцца тэматычныя «Дзённікі». У Санкт-Пецярбургу, дзе размесціцца наша зборная, будзе працаваць здымачная група «Беларусь 5», таму ад «Дзённікаў» гледачам варта чакаць эксклюзіву, — паабяцаў кіраўнік канала «Беларусь 5» Аляксандр Казюкевіч.

Акрамя таго, напярэдадні старту Чэмпіянату свету спартыўны тэлеканал упершыню пакажа мастацкі фільм!

У эфіры «Беларусь 5» будзе паказана захапляльная кінастужка «Легенда №17» пра нялёгкі лёс і неверагодны талент знакамітага савецкага хакеіста Валерыя Харламава.

**Алена ДРАПКО.**
*drapko@zviazda.by*

### ВТБ

**6.00, 17.00** «Лаві момант».
**6.30, 23.00, 4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.30** М/ф «Пінгвіняня Параро».
**8.00, 13.20** «Ералаш».
**8.30, 18.00** Серыял «Варонiны 3».
**9.30, 14.00, 19.00** Серыял «Апошні з Магікян 5».
**10.30, 15.00, 20.00** Серыял «Вечны водпуск».
**11.30** Камедыя «Бесталковыя».
**16.00, 5.00** «Турбаміксер».
**17.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**21.10** Камедыя «Бландзінка з амбіцыямі».



**23.30, 3.30** Серыял «Выжыць пасля 2».
**0.30, 3.00** «Дурні і дарогі».
**1.00** Серыял «Бязмоўны сведка».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** «Звычайны канцэрт з Эдуардам Эфіравым».
**10.35** Юбілей Наталлі Андрэйчанкі. «Мэры Попінс, да пабачэння!» Маст. фільм.
**12.55, 1.55** «Танцы дзікай прыроды». Дак. фільм.
**13.50** Міжнародны фестываль цырка ў Монтэ-Карла.
**14.50** Успамінаючы Яўгена Святланава. «Мініяцюры рускіх кампазітараў».
**15.40** Хрустальны баль «Хрустальны Турандот» у гонар тэатра «Ленкам».
**16.40** «Настаўнік, які пабудаваў дом. Марк Захараў». Дак. фільм.
**17.35** Васіль Ладзюк. Песні нашай Радзімы.
**19.10** «Алег Басілашвілі. Аб сябрах-таварышах, пра час і пра сябе». Выбранае. Дак. фільм.
**20.00** «Восенькі марафон». Маст. фільм.
**21.35** «Рамантыка рамансa». Шлягеры 60-х.
**22.30** «Мадам Нобель. Любоў дзеля міру». Маст. фільм.
**0.05** «Пра Фядота-стральца, удалага малайца». Аўтар і выканаўца Леанід Філатаў.
**1.05** Легенды свінга. Валерый Кісялёў і Ансамбль класічнага джаза.
**2.50** «Эдгар По». Дак. фільм.

### Настальгія

**6.00** «Акулы пяра». Юрый Антонаў.
**6.40, 8.25, 10.15, 13.00, 14.40, 15.40, 17.00, 18.50, 20.45, 21.40, 23.00, 0.50, 2.40, 5.10** Музычная настальгія.
**7.30** Канцэрт групы «Алиса». 1988 год.
**9.00** Маст. фільм «Дні лётныя».
**12.00** «Спяём, сябры!» з Таццянай Візбар: Кім Юлій. 2007 год.
**13.25** Маст. фільм «Сярод тысячы дарог...».
**15.00, 21.00** «Мінулы час».
**16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».
**18.00** «Быў час» з Аляксандрам Палітко́ўскім: «Мае 6 сотак». 2007 год.
**19.10** Маст. фільм «Халодны сакавік».
**0.00** «Народжаныя ў СССР». Найлепшае. Філіп і Бедрос Кіркоравы. 2012 год.
**1.20** «Зямля—Паветра». Валерый Кіпелаў. 2003 год.
**3.00** «Быў час». 2010 год.
**4.00** Кінаальманах «Таварыш песня».

### EuroSport 1

**4.00, 16.00, 2.30** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**5.30, 6.25, 19.00, 19.55** Футбол. Еўрагалы.
**5.35, 19.05** Футбол. Чэмпіянат MLS. Найлепшыя моманты.
**6.00, 19.30** Футбол. «Дарога на еўра».
**6.30, 11.00** Супербайк. Чэмпіянат свету.
**7.30, 14.00, 20.05** Снукер. Чэмпіянат свету. Фінал.
**9.30, 0.00** Веласпорт. Тур Фландрыі.
**12.00, 21.30** Веласпорт. Тур Ёркшыра.
**13.00, 22.30** Watts.
**19.00, 19.55** Футбол. Еўрагалы.
**19.30** Футбол. «Дарога на еўра».
**23.30** «Дух паруснага спорту».
**1.30** Веласпорт. Парыж — Рубэ.

### Камедыя

**0.35** Камедыя «На здрадзе».
**2.10** Серыял «Маё вялікае армянскае вяселле».
**5.45** Камедыя «Supeгнянь».
**7.15** Камедыя «Матулі».
**8.55** Камедыя «Здзелка».
**10.40** Камедыя «Шалёныя выкладчыкі».
**12.15** Камедыя «Як выкрасці дыямент».
**14.00, 14.50, 15.40** Скетчкам «Паміж намі».
**14.20, 15.10** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Камедыя «Высакародны венецыянец».
**17.55** Камедыя «Халасцячкі».
**19.30** Камедыя «Фантамас разбушаваўся».
**21.15** Камедыя «Ад 180 і вышэй».
**23.00** Камедыя «Шэф».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.40** «Доктар І...»
**8.10, 19.00, 1.20** «Падарунак лёсу». Серыял.
**9.50, 3.40** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**10.45, 4.25** «Па справах непаўналетніх». Дак. серыял.
**11.45, 16.05** «Хатні рэстаран».
**12.40** «Магія прыгажосці».
**13.35** «Тайныя знакі».
**14.30** «Псіхасаматыка».
**15.05** «Каменская». Серыял.
6.1. юридическое лицо, индивидуальный предприниматель заявляют об участии в конкурсе в качестве потенциального исполнителя мероприятия посредством подачи организатору конкурса заявки на участие в конкурсе, составленной в соответствии с требованиями, установленными пунктами 19 – 22 Инструкции о порядке проведения конкурсного отбора исполнителей мероприятий государственных программ, не являющихся подчиненными бюджетными организациями, и иными требованиями, указанными в настоящем извещении о проведении конкурса;

6.2. место (почтовый адрес) приема заявок на участие в конкурсе: 220030, г. Минск, ул. Кирова, 15;

6.3. дата конечного срока приема заявок на участие в конкурсе 24 мая 2016 г.;

6.4. одним участником может быть подана только одна заявка на участие в конкурсе;

6.5. к участию в конкурсе комиссией допускаются:

6.5.1. юридические лица:

не являющиеся подчиненной бюджетной организацией заказчика;

не находящиеся в процессе ликвидации или реорганизации (за исключением юридического лица, реорганизуемого в форме присоединения к нему другого юридического лица);

6.5.2. юридические лица, индивидуальные предприниматели:

не признанные в установленном законодательством порядке экономически несостоятельными (банкротами), за исключением юридического лица, находящегося в процедуре санации;

не включенные в соответствии с Законом Республики Беларусь от 13 июля 2012 года «О государственных закупках товаров (работ, услуг)» (Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь, 21.07.2012, 2/1971) в список поставщиков (подрядчиков, исполнителей), временно не допускаемых к участию в процедурах государственных закупок;

6.5.3. индивидуальные предприниматели, не находящиеся в стадии прекращения деятельности.

6.6. перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в конкурсе:

6.6.1. документы, указанные в пункте 9 настоящего извещения о проведении конкурса.

**7. Срок для отказа от конкурса организатором конкурса:**

7.1. организатор конкурса вправе отказаться от проведения конкурса не позднее чем за 5 (пять) календарных дней до даты проведения конкурса.

**8. Срок для заключения договора на выполнение мероприятий:**

8.1. срок для направления организатором конкурса участнику, выигравшему конкурс, двух экземпляров договора на выполнение мероприятий, составленного организатором конкурса по результатам проведения конкурса, подписанных уполномоченным представителем организатора конкурса, до 14 июня 2016 г;

8.2. срок для направления участником, выигравшим конкурс, организатору конкурса одного из двух экземпляров договора на выполнение мероприятий, полученных им от организатора конкурса, подписанного уполномоченным представителем организатора конкурса и участником, выигравшим конкурс, до 20 июня 2016 г.

**9. Перечень требований, предъявляемых к участникам, с указанием перечня документов, представляемых участником организатору конкурса в подтверждение соответствия каждому требованию:**

| Название требования, предъявляемого к участнику | Перечень документов, предоставляемых участником в подтверждение соответствия требованию |
|---|---|
| 1. финансовое состояние участника | справка из обслуживающего банка |
| 2. опыт работы в финансовых вопросах целевого и эффективного использования средств республиканского бюджета и наличие программного обеспечения для работы с казначейством Минфина, а также специализированной бухгалтерской программы 1С и опыта работы с данными программами | справка о среднегодовом объеме целевого и эффективного использования финансовых средств республиканского бюджета в среднем за последних три года и наличии программного обеспечения и программы 1С, подписанная руководителем организации, участника конкурса и заверенная печатью |
| 3. опыт работы в распределении оригинальных и элитных семян сельскохозяйственных растений для субъектов хозяйствования республики в соответствии с объемами, утверждаемыми Минсельхозпродом, и потребностью субъектов хозяйствования республики в данных семенах | справки о среднегодовом объеме распределения оригинальных семян зерновых растений для субъектов хозяйствования Республики Беларусь в среднем за последних три года и среднегодовом объеме распределения элитных семян зерновых растений для субъектов хозяйствования Республики Беларусь в среднем за последних три года, подписанная руководителем организации, участника конкурса и заверенная печатью |
| 4. опыт работы в вопросах организации и проведения тендера (конкурса) на закупку и поставку семян сельскохозяйственных растений за счет собственных средств субъектов хозяйствования и средств республиканского бюджета | справка о ежегодно проводимых тендерах на закупку и поставку семян сельскохозяйственных растений за счет собственных источников и бюджетных средств, в среднем за последние три года в стоимостном выражении, подписанная руководителем организации, участника конкурса и заверенная печатью |
| 5. опыт работы по осуществлению координации и учета в семеноводстве оригинальных и элитных семян сельскохозяйственных растений в процессе взаимодействия между субъектами семеноводства республики и государственными, а также научными организациями | справка о количестве сельскохозяйственных субъектов республики, с которыми ведется работа в вопросах координации и обеспечения взаимодействия в семеноводстве сельскохозяйственных растений в среднем за последние три года, подписанная руководителем организации, участника конкурса и заверенная печатью |

УНП 100377914

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
## общества с ограниченной ответственностью «Форвард-Брокер» за 2015 год

220007, г. Минск, ул. Авакяна, 19, пом. 191, к. 14, тел./факс (017) 228-12-89

(в млн. бел. руб.)

| АКТИВЫ | Код строки | На 31 декабря 2015 года | На 31 декабря 2014 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Основные средства | 110 | 1 291 | 1 259 |
| Запасы | 210 | 86 | 80 |
| Расходы будущих периодов | 230 | 6 | 4 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным, товарам, работам, услугам | 240 | 154 | 158 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 597 | 518 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | - | 665 |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 2 477 | 995 |
| **БАЛАНС** | **300** | **4 611** | **3 679** |
| **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | **Код строки** | **На 31 декабря 2015 года** | **На 31 декабря 2014 года** |
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Уставный капитал | 410 | 348 | 348 |
| Добавочный капитал | 450 | 1 261 | 1 038 |
| Нераспределенная прибыль | 460 | 2 274 | 2 162 |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 125 | 131 |
| Доходы будущих периодов | 650 | 603 | 0 |
| **БАЛАНС** | | **4 611** | **3 679** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
## общества с ограниченной ответственностью «Форвард-Брокер» за 2015 год

(в млн. бел. руб.)

| Наименование показателя | Код строки | За январь-декабрь 2015 года | За январь-декабрь 2014 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 9 370 | 8 527 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (608) | (559) |
| Валовая прибыль (010-020) | 030 | 8 762 | 7 968 |
| Управленческие расходы | 040 | (2498) | (2346) |
| Прибыль от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 060 | 6 264 | 5 622 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 243 | 238 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (243) | (239) |
| Прибыль от текущей деятельности | 090 | 6 264 | 5 621 |
| Доходы от инвестиционной деятельности | 100 | 383 | 319 |
| в том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | 22 | - |
| проценты к получению | 103 | 361 | 319 |
| прочие доходы по инвестиц. деятельности | 104 | - | - |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | (3) | - |
| в том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | (3) | - |
| прочие расходы по инвестиц. деятельности | 112 | - | - |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 221 | 120 |
| в том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 221 | 120 |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (192) | (16) |
| в том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | (192) | (16) |
| Прибыль от инвестиционной и финансовой деятельности | 140 | 409 | 423 |
| Прибыль до налогообложения | 150 | 6 673 | 6 044 |
| Налог на прибыль | 160 | (1201) | (1088) |
| Чистая прибыль | 210 | 5 472 | 4 956 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль | 220 | 225 | - |
| Совокупная прибыль | 240 | 5 697 | 4 956 |

**Годовую индивидуальную отчетность ООО «Форвард-Брокер» за 2015 год в полном объеме можно получить по адресу: г. Минск, ул. Авакяна, 19, пом. 191, к. 14.**

## АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ
## по бухгалтерской отчетности Общества с ограниченной ответственностью «Форвард-Брокер» за период с 01 января по 31 декабря 2015 года

Директору Общества с ограниченной ответственностью «Форвард-Брокер» Сергееву Сергею Леонидовичу

***Аудируемое лицо***:

Общество с ограниченной ответственностью «Форвард-Брокер» (далее – ООО «Форвард-Брокер»).

Республика Беларусь, 220007, г. Минск, улица Авакяна, д. 19, пом. 191, к. 14.

Деятельность ООО «Форвард-Брокер» зарегистрирована приказом Министерства финансов Республики Беларусь от 21 апреля 2006 года № 136, регистрационный номер в ЕГР 806000181.

***Аудиторская организация***:

Аудитор, осуществляющий деятельность в качестве индивидуального предпринимателя, Ткач Светлана Ивановна.

220022, г. Минск, ул. Чайлытко, д. 20, кв. 64.

Свидетельство о государственной регистрации индивидуального предпринимателя от 24 августа 2000 г. № 955 выдано Минским горисполкомом, регистрационный номер в ЕГР 100990426.

Квалификационный аттестат аудитора № 0000077 выдан на основании приказа Министерства финансов Республики Беларусь от 1 октября 2002 года № 1204 регистрационный номер 76.

Мною проведен аудит прилагаемой бухгалтерской отчетности ООО «Форвард-Брокер», состоящей из бухгалтерского баланса на 31.12.2015 г., отчета о прибылях и убытках, отчета об изменении капитала, отчета о движении денежных средств за 2015 год, примечаний к бухгалтерской отчетности.

***Обязанность руководства по подготовке бухгалтерской отчетности***

Руководство ООО «Форвард-Брокер» несет ответственность за составление и представление бухгалтерской отчетности в соответствии с законодательством Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности и организацию системы внутреннего контроля, необходимой для составления бухгалтерской отчетности, не содержащей существенных искажений, допущенных вследствие недобросовестных действий или ошибок.

***Обязанность аудиторской организации***

Я несу ответственность за выраженное мною мнение о достоверности данной бухгалтерской отчетности, основанное на результатах проведенного аудита.

Я провела аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь № 56-З от 12 июля 2013 года «Об аудиторской деятельности», национальных правил аудиторской деятельности, которые обязывают меня соблюдать нормы профессиональной этики, планировать и проводить аудит таким образом, чтобы обеспечить достаточную уверенность относительно наличия либо отсутствия существенных искажений в представленной бухгалтерской отчетности.

В ходе аудита мною были выполнены аудиторские процедуры, направленные на получение аудиторских доказательств, подтверждающих значения показателей бухгалтерской отчетности ООО «Форвард-Брокер», а также другую раскрытую в ней информацию. Выбор аудиторских процедур осуществлялся на основании профессионального суждения с учетом оценки риска существенного искажения бухгалтерской отчетности в результате ошибок или недобросовестных действий. При оценке риска существенного искажения бухгалтерской отчетности мною рассматривалась система внутреннего контроля ООО «Форвард-Брокер», необходимая для составления бухгалтерской отчетности, не содержащей существенных искажений, с целью планирования аудиторских процедур, соответствующих обстоятельствам аудита, но не с целью выражения мнения относительно эффективности функционирования этой системы.

Аудит также включал оценку применяемой учетной политики, обоснованности учетных оценок и общего содержания бухгалтерской отчетности ООО «Форвард-Брокер».

Я полагаю, что в ходе аудита мною были получены достаточные и надлежащие аудиторские доказательства, которые могут являться основанием для выражения аудиторского мнения.

***Аудиторское мнение***

По моему мнению, бухгалтерская отчетность ООО «Форвард-Брокер» достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ООО «Форвард-Брокер» на 31 декабря 2015 г., а также финансовые результаты его деятельности и движение денежных средств за 2015 год в соответствии с законодательством Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности.

Аудитор, осуществляющий деятельность в качестве индивидуального предпринимателя С.И. Ткач

10 марта 2016 г.

■ Ёсць пытанне

# ВАНДРАВАННІ БЕЗ МЕЖАЎ

## Калі ўступіць у дзеянне пагадненне аб спрашчэнні візавага рэжыму?

**Марцін Люранец — паляк, які свайго жыцця не ўяўляе без падарожжаў. Ён марыць, каб ва ўсім свеце адмянілі візы! «Тады кожны чалавек мог бы сабе дазволіць вандраваць, пры гэтым не трацячы на візавыя працэдуры свой час, грошы і нервы...» Цікавы гэты хлопец тым, што калекцыянуе сталіцы свету. Дабіраецца да іх пераважна аўтастопам, фотаздымкі выкладае на сваёй старонцы ў «Фэйсбуку». Не так даўно калекцыя Марціна (пакуль яна налічвае 29 гарадоў) папоўнілася і сталіцай Беларусі.**



**Марцін трапіў у Беларусь без візы, дзякуючы чэмпіянату па хакеі.**

У Мінск ён марыў трапіць даўно, гэта ж па-суседстве. Спыняла тое, што трэба было рабіць візу. Таму, калі хлопец даведаўся, што можна купіць квіток на чэмпіянат па хакеі (ён абышоўся яму танней, чым самая танная — аднаразовая — віза) і наведаць Мінск без візы, скарыстаўся гэтай магчымасцю, не раздумваючы. Падчас той паездкі паспеў наведаць яшчэ Віцебск і Гродна. У найбліжэйшых планах Марціна набыць мікрааўтобус і завітаць у Белавежскую пушчу...

«Каб прыцягнуць турыстаў з Еўрасаюза, мы ўжо зрабілі бязвізавы ўезд на тры дні ў Белавежскую пушчу. Тое ж самае плануем зрабіць на Аўгустоўскім канале», — сказаў **міністр спорту і турызму Беларусі Аляксандр ШАМКО** на міжнародным кірмашы турысцкіх паслуг «Адпачынак-2016». — Прапанова зараз разглядаецца ва ўрадзе. Турыстычны прадукт, які прапануе сёння Аўгустоўскі канал, адпавядае патрабаванням, што прад'яўляюцца да падобных курортаў у свеце. Там створана неабходная інфраструктура — ад велатурызму да байдарак і пешых маршрутаў. Змякчэнне візавых патрабаванняў на Аўгустоўскім канале, безумоўна, будзе спрыяць павелічэнню колькасці турыстаў і прынясе эканамічны эфект».

Марына П. з Брэста штогод падае дакументы ў польскае пасольства на мультывізу. І кожны раз аддае за яе 60 еўра. Дзяўчына таксама марыць пра той час, калі беларусам можна будзе ездзіць у Еўропу без візы, ну ці хоць бы плаціць за яе крыху менш. «А яшчэ я спадзяюся, што неўзабаве амерыканскую візу можна будзе атрымаць у Беларусі. Сястра вось ужо год жыве ў ЗША, летам яна выходзіць замуж. І для таго, каб мне і бацькам трапіць на вяселле, трэба ехаць у Маскву, Кіеў, ці Варшаву. Бо ў Мінску консульства выдае амерыканскія візы толькі асобным катэгорыям грамадзян». Мала таго, што вы страчваеце час і грошы на паездкі, дык яшчэ ніхто не можа даць гарантыі, што дазвол на ўезд пашчасціць атрымаць з першага разу. Мне расказвалі гісторыю дзяўчыны, сястра якой таксама жыве ў Амерыцы. Яна падавала дакументы разам са сваім хлопцам. Яму далі візу, а ёй — адмовілі...

Сям'я Мальцавых з Магілёва (муж і жонка і іх 13-гадовая дачка) летась ездзіла адпачываць у Балгарыю. За тры візы яны заплацілі 180 еўра. Але гэта толькі консульскія зборы. Паколькі яны жывуць не ў Мінску, давялося плаціць яшчэ і за паліва, каб даехаць да консульства — спачатку для асабістай падачы дакументаў, потым — каб іх забраць.

— Акрамя сталіцы, консульствы некаторых краін ЕС ёсць толькі ў Гродне (Польшчы і Літвы), Брэсце (Польшчы) і Віцебску (Латвіі), — паведаміла **прадстаўніца грамадскай кампаніі «У Беларусь і Еўропу — БЕЗ ВІЗЫ!» Вераніка ЮРАНКОВА**. — Вядома, можна звярнуцца ў афіцыйны візавы цэнтр, калі ён знаходзіцца бліжэй, але там таксама бяруць грошы за свае паслугі, звычайна каля 15-20 еўра з чалавека.

**Беларусь — адзіная краіна ва Усходняй Еўропе, грамадзяне якой плацяць за шэнгенскую візу 60 еўра.**

А яшчэ трэба заплаціць за фотаздымкі, медыцынскія страхоўкі плюс часовыя страты на падрыхтоўку камплектаў візавых дакументаў. У выніку, рэальныя выдаткі за атрыманне шэнгенскай візы для беларускай сям'і з трох чалавек могуць абысціся ў 250 еўра.

— Не ўсе ведаюць, што дзіцяці да 6, а ў асобных консульствах і да 12 гадоў, віза выдаецца бясплатна. Некаторыя турфірмы нажываюцца на няведанні людзей, — звярнула ўвагу Вераніка Юранкова. — Каб людзі маглі пазбегнуць падобных пастак, мы стварылі інструкцыю па атрыманні шэнгенскіх віз, якую можна пагледзець анлайн: http://www.visaguide.eu/belarus/. А зусім нядаўна дзякуючы намаганням нашых валанцёраў быў запушчаны сайт з рэкамендацыямі па атрыманні беларускай візы: http://belarusvisaguide.org/. Там шмат карыснай інфармацыі, якая дапаможа вам і вашым сябрам з-за мяжы не быць ашуканымі.

Наша краіна ўжо не першы год вядзе перамовы з Еўрасаюзам па спрашчэнні візавага рэжыму. Перагаворны працэс актывізаваўся пасля Вільнюскага саміту Усходняга партнёрства, які адбыўся ў лістападзе 2013-га.

— Беларусь з'яўляецца адным з сусветных лідараў па колькасці выданых шэнгенскіх віз, — адзначыў **прадстаўнік грамадскай кампаніі «У Беларусь і Еўропу — БЕЗ ВІЗЫ!» Алесь ГЕРАСІМЕНКА**. — Паводле звестак Еўракамісіі, у 2015 годзе беларусы атрымалі іх больш за 750 тысяч. Наперадзе толькі Расія, Кітай і Украіна. Па ліку ж такіх віз на душу насельніцтва наша краіна займае першае месца. У нас таксама і самы маленькі сярод краін, якія мяжуюць з ЕС, паказчык адмоў у візе — 0,3%. І пры гэтым Беларусь — адзіная краіна ва Усходняй Еўропе, грамадзяне якой плацяць за шэнгенскую візу 60 еўра. Гэта не маленькія грошы.

З краін СНД толькі Малдова атрымала бязвізавы рэжым з ЕС. Грузія і Украіна практычна падышлі да адмены віз. Ва Украіне, Расіі, Грузіі, Арменіі, Азербайджане дзейнічаюць пагадненні аб спрошчаным візавым рэжыме з ЕС. Таму грамадзяне гэтых краін плацяць за шэнгенскую візу 35 еўра. Беларусь як краіна Усходняга партнёрства таксама можа прэтэндаваць на такое пагадненне. Перамовы па гэтым пытанні пачаліся ў пачатку 2014 года.

— Беларусы — неверагодна законапаслухмяная нацыя вандроўнікаў. Таму яны, можна сказаць, заслужылі як мінімум зніжэння кошту консульскага ўзносу да 35 еўра, — лічыць Алесь Герасіменка. Па прагнозах эксперта, пагадненне аб спрашчэнні візавага рэжыму можа ўступіць у дзеянне да саміту Усходняга партнёрства, які пройдзе ў 2018 годзе ў Эстоніі.

У лідарах сярод краін ЕС па колькасці выдадзеных беларусам віз — Польшча.

— Летась консульскія ўстановы нашай краіны паставілі грамадзянам Беларусі больш за 400 тысяч дазвольных штампаў. Гаворка ідзе не толькі пра Шэнген. Кожная чацвёртая віза ў гэтай статыстыцы — бясплатная нацыянальная, тыпу D. Ёсць пэўныя катэгорыі людзей, якія могуць атрымаць бясплатную візу: дзеці, палякі, якія жывуць у Беларусі, большасць афіцыйных дэлегацый не плаціць, спартсмены, журналісты... З мінулага года пачалі выдаваць на 2 гады турыстычныя візы. Гэта цудоўна, што расце колькасць доўгатэрміновых віз (гадавых і двухгадовых) і бясплатных, — адзначыў **эксперт па пытаннях Усходняй Еўропы фонду імя Стэфана Баторыя Гжэгаж ГРАМАДЗКІ**. — Я, наогул, выступаю за шматразовыя візы на 5 гадоў. І людзям не трэба будзе штогод хадзіць у візавыя цэнтры. І вырашыцца праблема з чэргамі.

Паводле статыстыкі, адмоў у візах у дыппрадстаўніцтвах Польшчы ў Беларусі — менш за адзін працэнт.

Беларусы ж, якія жывуць у 50-кіламетровай прыгранічнай зоне з Польшчай і Літвой, чакаюць, калі нарэшце запрацуе малы прыгранічны рух (МПР). Перамовы аб яго ўвядзенні яшчэ ідуць.

— Дагаворы Беларусі з Польшчай і Літвой аб малым прыгранічным руху былі падпісаны яшчэ ў 2010 годзе, — паведаміў Алесь Герасіменка. — Аднак да гэтага часу не прайшлі ўсе патрэбныя ўнутрыдзяржаўныя працэдуры. У перспектыве ў рамках МПР спрошчана перасякаць граніцу і свабодна перамяшчацца па сумежнай прыгранічнай тэрыторыі змогуць 3 мільёны чалавек з Польшчы, Літвы і Беларусі.

— Напрыканцы мінулага года **старшыня Дзяржпагранкамітэта Беларусі Леанід МАЛЬЦАЎ** зазначыў, што арганізацыя малога памежнага руху з Літвой і Польшчай немагчымая без стварэння інфраструктуры: «Усяго на беларуска-польскім і беларуска-літоўскім напрамках 26 пунктаў пропуску праз мяжу. Сёння яны не проста загружаныя, а перагружаныя ў два-тры разы. Для таго, каб ажыццяўляць малы прыгранічны рух, трэба іх усе мадэрнізаваць, стварыць інфраструктуру, абсталяваць пешаходнымі напрамкамі, павялічыць штат пагранічнікаў, некаторым з пунктаў надаць статус міжнародных. Добраўпарадкаванне аднаго пункта пропуску абыдзецца ў 30-50 млрд беларускіх рублёў. Калі мы цяпер адкрыем прыгранічны рух з гэтымі краінамі, утворацца вялізныя чэргі. Атрымаецца, што мы проста падманем людзей».

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
*dryla@zviazda.by*
*Мінск — Варшава — Мінск.*

***За дапамогу ў падрыхтоўцы матэрыялу аўтар выказвае падзяку арганізатарам прэс-тура ў Варшаву — грамадскай ініцыятыве «У Беларусь і Еўропу — БЕЗ ВІЗЫ!» (Novisa.by) і Цэнтру візавай фасілітацыі і мабільнасці.***

• Чулі?

### У ЗАМЕЖНЫХ ТУРЫСТАЎ БУДУЦЬ СКАНАВАЦЬ ТВАР

**У Еўрасаюзе плануюць змяніць правілы ўезду для замежнікаў. У іх пашпартах больш не будуць ставіць штампы. Замест гэтага плануюць сканаваць сятчатку вока ці нават увесь твар.**

У праекце рэформаў Еўракамісія прапануе сканаваць звесткі пашпарта, візы і біяметрыкі. Яны будуць параўноўвацца з інфармацыяй агульнай базы даных еўрапейскіх пагранічных службаў. На гэтай падставе і будзе выносіцца рашэнне аб праве чалавека на ўезд у Еўрасаюз. Таксама на пунктах пагранічнага кантролю ЕС паставяць тэрміналы, што павінна паскорыць працэс перасячэння мяжы. Аднак пакуль нельга дакладна сказаць, калі менавіта новаўвядзенні ўступяць у сілу: рэформы павінны прайсці шэраг узгадненняў ва ўладных інстытутах Еўрасаюза.

Ёсць і іншыя новаўвядзенні. Згодна з новымі правіламі, цяпер не абавязкова першы раз уязджаць у Еўрасаюз праз краіну, консульства якой выдала візу.

21 ДЕНЬ С LISTERINE

РЕЗУЛЬТАТЫ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «21 день с Листерин»

**1. Сведения об организаторе рекламной игры:**
Организатором рекламной игры является общество с ограниченной ответственностью «Рефорте Групп», УНП 191686475, место нахождения: 220030, Беларусь, г. Минск, пл. Свободы, д. 4, 3-й этаж, оф. 340, e-mail: post@forte.by.
На момент регистрации правил рекламной игры и проведения розыгрыша рекламной игры Организатор находился по адресу: 220012, Беларусь, г. Минск, ул. Толбухина, д. 2, 3-й этаж, помещение 10-В.
**2. Наименование рекламной игры:** «21 день с Листерин».
**3. Срок начала рекламной игры:** 08 февраля 2016 г.
**4. Срок окончания рекламной игры:** 30 апреля 2016 г.
**5. Сведения о государственной регистрации рекламной игры:** рекламная игра зарегистрирована Министерством торговли Республики Беларусь 03.02.2016 г., свидетельство о государственной регистрации рекламной игры №2702.
**6. Сведения о количестве участников рекламной игры:** в рекламной игре приняло участие 13 человек.
**7. Сведения о розыгрыше призового фонда:** призовой фонд разыгран полностью.
**8. Сведения о победителях рекламной игры и их выигрыше:**

| Победители | Выигрыш |
| --- | --- |
| **Сапежинский С.В., г. Минск** | «Набор из 60 ополаскивателей для полости рта LISTERINE®» и денежное вознаграждение в размере суммы возмещения подоходного налога в связи с получением приза в сумме 225800 белорусских рублей. |
| **Клименок О.А., г. Минск** | «Набор из 60 ополаскивателей для полости рта LISTERINE®» и денежное вознаграждение в размере суммы возмещения подоходного налога в связи с получением приза в сумме 225800 белорусских рублей. |
| **Ивашко В.С., Минская обл., г. Несвиж** | «Набор из 60 ополаскивателей для полости рта LISTERINE®» и денежное вознаграждение в размере суммы возмещения подоходного налога в связи с получением приза в сумме 225800 белорусских рублей. |

**9. Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры: +375 (29) 678-94-39.**

■ Творчы падыход

# ПЕСНІ ПАТРЫЁТАЎ

## Карэспандэнты «Звязды» пабывалі на XIX тэлевізійным фестывалі армейскай песні

**Афіцэры і людзі без пагонаў, курсанты, суvotраўцы і звычайныя школьнікі, прафесійныя артысты і аматары — 19-ы раз тэлевізійны фестываль армейскай песні «Зорка» сабраў на адной сцэне ўлюбёных у творчасць. Пераможцаў штогадовага конкурсу вызначылі ў чатырох намінацыях — «Выканаўцы ваенна-патрыятычнай песні», «Аўтары-выканаўцы», «Вакальныя групы і ансамблі», «Выканаўцы армейскай песні». Нумары канкурсантаў былі настолькі моцнымі, што на гэты раз гран-пры не дастаўся нікому.**

— За гады існавання фестываль аб'яднаў вакол сябе некалькі тысяч ваеннаслужачых, членаў іх сем'яў, асоб грамадзянскага персаналу, грамадзян нашай краіны, — адзначыў падчас цырымоніі ўзнагароджання лаўрэатаў **памочнік міністра абароны па ідэалагічнай рабоце ва Узброеных Сілах — начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны генерал-маёр Аляксандр ГУРА**. — Фестываль выйшаў за межы Узброеных Сіл і набыў ужо сапраўды рэспубліканскі маштаб, карыстаецца заслужаным аўтарытэтам і павагай. За 19 гадоў больш за 16 тысяч яго ўдзельнікаў набылі не толькі вопыт творчай дзейнасці ў межах конкурсу. Многія лаўрэаты і намінанты атрымалі пуцёўку ў далейшае творчае жыццё і паспяхова рэалізуюць сябе на гэтым шляху, годна несучы сэнс і глыбіню ўкладзеных у рамках фестывалю патрыятызму, павагі і любові да сваёй Айчыны.

Фестываль армейскай песні «Зорка» — адзіны фестываль у краінах СНД, які праводзіцца з поўнай тэлевізійнай версіяй і гала-канцэртам. Гэта сведчыць пра высокую ацэнку майстэрства выканаўцаў. Многія з іх праслаўляюць сёння армейскую культуру, выступаючы на шматлікіх пляцоўках нашай краіны і па-за яе межамі.

— Заўсёды цешыць, калі маладыя людзі спяваюць пра сучасную армію, Вялікую Перамогу, свой дом, нашу зямлю, — перакананы **кіраўнік Акадэмічнага ансамбля песні і танца Узброеных Сіл палкоўнік Уладзімір ВАРАПАЕЎ**. — Больш за тое, многія з іх пішуць словы і музыку — гэтакія самародкі. І чым больш мы знойдзем такіх талентаў, тым большая карысць будзе для нашай краіны.

І сапраўды, многія вядомыя сёння спевакі пачалі свой творчы шлях дзякуючы фестывалю. Некаторыя ўвогуле пасля ўдзелу ў "Зорцы" кардынальна мянялі сваё поле дзейнасці. Такі лёс неўзабаве чакае і лаўрэата першай прэміі ў намінацыі «Аўтары-выканаўцы», салдата тэрміновай службы Валерыя Грэсіка. Яго, наводчыка танкавай роты танкавага батальёна 6-й асобнай механізаванай брыгады, запрасілі ў Акадэмічны ансамбль песні і танца Узброеных Сіл.

Артысты гэтага творчага калектыву, дарэчы, упрыгожылі фестывальны гала-канцэрт. Разбавілі канцэртную праграму дуэты пераможцаў розных гадоў. Цікавы дуэт быў і сярод лаўрэатаў. Курсант Ваеннай акадэміі Мікіта Каваленка выйшаў на адну сцэну са сваёй мамай. Творчы дуэт быў створаны задоўга да таго, як юнак вызначыўся з будучай прафесіяй.



Фота Надзеі БУЖАН.

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*

---

Уладзімір ЛІПСКІ:

# «ЗА ЧАС ПЕНСІІ Я ПРАПЛЫЎ БОЛЬШ ЗА ТЫСЯЧУ КІЛАМЕТРАЎ»

## Самы вопытны ўдзельнік чэмпіянату краіны па плаванні ўстанавіў рэкорд Беларусі

**Напярэдадні на базе пяцідзесяціметровага алімпійскага басейна брэсцкага Палаца водных відаў спорту адбыўся першы чэмпіянат Беларусі па плаванні ў катэгорыі «Мастэрс». Ён прайшоў адразу за розыгрышам медалёў сярод прафесійных спартсменаў. У спаборніцтвах прынялі ўдзел каля 70 чалавек ва ўзросце ад 25 да 76 гадоў.**

Самым старэйшым па ўзросце спартсменам турніру стаў пісьменнік, галоўны рэдактар часопісаў «Вясёлка» і «Буся» Уладзімір Ліпскі. Ён выступіў на дыстанцыі 50 м вольным стылем і стаў рэкардсменам у сваёй узроставай катэгорыі. Пісьменнік паказаў час — 1 хвіліна і 1 сотая секунды.

Уладзімір Сцяпанавіч расказвае, што ў яго пасляваенныя дзяцінства думаць пра спорт не было часу — трэба было дапамагаць бацькам па гаспадарцы, будавацца і не забываць пра вучобу ў школе. Але цяпер, калі пісьменнік вось ужо колькі гадоў з'яўляецца галоўным рэдактарам часопісаў для дзяцей, на старонках выдання і ў яго ўласных кнігах слоў пра спорт шмат, бо краіне патрэбна здаровае пакаленне.

— Калі ўсё жыццё ты пішаш і агітуеш весці здаровы лад жыцця, то павінен і сам паказваць прыклад, — пачынае размову Уладзімір Сцяпанавіч. — Я захапляюся і бацькамі, і дзецьмі, якія займаюцца спортам. Гэта незвычайна мужныя і цярплівыя людзі. Чаму? Гэта ж трэба быць адданым справе ўсё жыццё і ўвесь час імкнуцца да вяршыняў, ставіць перад сабой бар'еры і пераадольваць іх. У Брэсце такама ў мяне была сустрэча з юнымі спартсменамі, і галоўнае, што я хацеў бы сказаць ім, — гэта тое, што перш за ўсё трэба развіць «мускулы душы». Гэта значыць адчуць, хто ты і што робіш на гэтым свеце. Такое разуменне дапаможа быць фізічна і маральна здаровым, радавацца кожнаму дзянёчку.

Самога Уладзіміра Сцяпанавіча займацца спортам падштурхнуў выпадак, які адбыўся яшчэ ў школьныя гады. Аднойчы на ўроку фізкультуры настаўнік вывеў дзяцей на стадыён і папрасіў падцягнуцца на перакладзіне.

— Я павіс на турніку і адчуў, што больш зрабіць нічога не магу. Потым ішоў дадому і плакаў, мне было так сорамна перад усімі! Лес тады быў побач з хатай, таму дрэва шмат, я выразаў два слупкі, знайшоў нейкі прут і зрабіў сабе турнік, а праз месяц паказваў аднагодкам пад'ём з пераваротам.

Па асабістых падліках Уладзіміра Ліпскага, з 2000-га па 2016 год (а гэта час яго пенсіі) ён праплыў у басейне 1 тысячу 6 кіламетраў, а за мінулы 2015 год, напрыклад, — 106 кіламетраў. З такімі паказчыкамі яго і запрасілі на турнір у Брэст.

— Лепш хадзіць у басейн, чым у аптэку. Калі ты адчуваеш сябе здаровым, то можаш шмат зрабіць і ў сваёй прафесіі, і ў адносінах з людзьмі.



**Уладзімір ЛІПСКІ (у цэнтры) з рэкардсменамі свету — плыўцамі клуба «Зубр».**

Уладзімір Сцяпанавіч адзначае, што запрашэнне на турнір «Мастэрс» у Брэст прыняў з задавальненнем і ў наступным годзе паспрабуе паказаць яшчэ лепшы вынік.

— На Беларусі нарадзілася добрая традыцыя — праводзіць такія турніры. У свае 76 гадоў я спаборнічаў у басейне з сапраўднымі спартсменамі, якія дзень таму змагаліся за пуцёўкі на Алімпійскія гульні. Ведаеце, калі азірнуцца на той пражыты дзень, я прыгадаў бы прымаўку «Жыццё — не тыя дні, якія прайшлі, а тыя, якія запомніліся».

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

---

■ Мы памятаем!

# КВЕТКІ ПАД МІРНЫМ НЕБАМ

## Гадавіну Перамогі адзначаць фестывалем у цэнтры сталіцы

**Адным з галоўных мерапрыемстваў Года моладзі стаў праект «Кветкі Вялікай Перамогі», прымеркаваны да 70-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Сёлета ён набудзе новае ўвасабленне — падчас міжнароднага форуму «Вялікая Перамога, здабытая адзінствам» Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі даў старт шэрагу патрыятычных мерапрыемстваў.**

— Акцыя «Кветкі Вялікай Перамогі» нарадзілася летась па ініцыятыве нашай моладзі, — расказаў **першы сакратар ЦК БРСМ Андрэй БЕЛЯКОЎ**. — Быў прапанаваны сімвал праекта — яблыневая кветка на чырвона-зялёнай стужцы. Мы атрымалі падтрымку ад Прэзідэнта краіны на маладзёжным форуме і правялі шэраг акцый. Сярод іх вылучаўся «Цягнік Перамогі», які праехаў па ўсіх рэгіёнах Беларусі. Прайшло нямала іншых вельмі важных і вартых увагі мерапрыемстваў. Галоўнай мэтай было яшчэ раз нагадаць, якую цану заплаціў наш народ за тое, каб перамагчы. Праект без перабольшвання стаў агульнанацыянальным, і сёлета мы вырашылі яго працягнуць. Вельмі прыемна, што да яго падключыліся прадстаўнікі самых розных арганізацый.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Плануюцца шматлікія сустрэчы з ветэранамі, «дыялогі пакаленняў», інтэрнэт-праекты. Відовішчным стане оўпэн-эйр (фестываль пад адкрытым небам) «Кветкі Вялікай Перамогі», які правядуць на Кастрычніцкай плошчы Мінска 8 мая. Тут прадставяць інтэрактыўную экспазіцыю з пляцоўкамі-прэзентацыямі ад кожнай вобласці, тэатралізаваныя пастаноўкі, выставы рэканструяванай і адноўленай ваеннай тэхнікі.

— Мне ў першую чаргу хацелася б сёння сустрэцца са сваімі аднадумцамі — маладымі ўдзельнікамі пошукавых атрадаў, — сказаў **другі сакратар Брэсцкага гарадскога камітэта БРСМ, камандзір атрада «Вернутыя імёны» Пётр ПІЦКО**. — Сёлета будзе праводзіцца шэраг экспедыцый; магчыма, удасца прыцягнуць новых людзей.

— У акцыях праекта «Кветкі Вялікай Перамогі» мы ўдзельнічалі і летась, — кажа **трэцякурснік Полацкага дзяржаўнага аграрна-эканамічнага каледжа Андрэй БУТ-ГУСАІМ**. — Асабліва запомніўся «Цягнік Перамогі», які праехаў больш за тры тысячы кіламетраў па Беларусі. Гэтая акцыя спрыяе выхаванню ў нашага пакалення свядомага патрыятызму і памяці аб адной з найбольш трагічных падзей у гісторыі краіны. Таму вельмі прыемна, што сёлета нас зноў запрасілі на старт новай акцыі, і мы абавязкова возьмем у ёй удзел.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

---


# БОБОВИЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ГОМЕЛЬСКОГО РАЙОНА

**1 июня 2016 года в 15.00 проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов**

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь земельного участка | Инженерная инфраструктура | Расходы по подготовке (руб.) | Начальная цена земельного участка (руб.) | Задаток (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **1** | Гомельский район, Бобовичский с/с, д. Уза, ул. Лесная, участок №69 | 321080801201000260 | 0,1388 га | Имеется возможность электроснабжения, газификации | 13132600 и расходы за опубликование в СМИ | 127048200 | 12704800 |
| 2 | Гомельский район, Бобовичский с/с, д. Уза, ул. Городская, участок №18 | 321080801201000261 | 0,1220 га | Имеется возможность электроснабжения, проводятся работы по централизованному водоснабжению | 13129100 и расходы за опубликование в СМИ | 69794150 | 6979400 |

**Аукцион состоится по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, д. 51А, зал заседаний Гомельского райисполкома 01.06.2016 в 15.00.**

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов, и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток в размере, порядке и сроке, определенные в извещении.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Документ, подтверждающий внесение суммы задатков (на расчетный счет с отметкой банка).

3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

3.1 представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае земельный участок предоставляется в частную собственность единственному участнику несостоявшегося аукциона, при его согласии, с внесением платы за земельный участок в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5%).

Внесение платы за предмет аукциона и возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, осуществляются в установленном порядке победителем аукциона или единственным участником аукциона в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

*Задаток за участие в аукционе перечисляется на расчетный счет №3641414020045 Бобовичского сельского исполнительного комитета, филиал №302 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Гомель, ул. Барыкина, 94, МФО 151501664, УНП 400178403.*

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: Гомельский район, агрогородок Бобовичи, ул. Пролетарская, 1А, Бобовичский сельский исполнительный комитет, с даты опубликования извещения **до 27 мая 2016 года.**

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в Бобовичском сельском исполнительном комитете. Контактные телефоны: **+375291390201, (8-0232) 910234, 910244, 910247.**

■ Чалавек сярод людзей

# «ГАЛОЎНАЕ — РАТАВАЦЬ... ЯКАЯ РОЗНІЦА ДЗЕ?»

**Тры драўляныя баракі з тэрапеўтычным, педыятрычным, хірургічным і радзільным аддзяленнямі, амаль 28 тысяч насельніцтва... Выпускніку Віцебскага медінстытута, які на пачатку 1980-х па размеркаванні прыехаў у Глуск, было ад чаго разгубіцца. Тым больш што старэйшы калега, у якога малады збіраўся вучыцца, з'ехаў на курсы павышэння кваліфікацыі і назад не вярнуўся.**



Так цяжкі груз аперацый — з усімі наступствамі — лёг на плечы ўчарашняга студэнта. І ён, Уладзімір Цісіневіч, не спасаваў. Недзе за год асвоіў усе віды хірургічных умяшанняў: выразаў апендыксы, праводзіў трэпанацыю чэрапа, выдаляў жоўцевы пузыр, лячыў траўмы і раненні — ратаваў...

У 1975 годзе, як цяпер помню, я прыехаў да яго свайго трохгадовага сына з прыкметамі перытаніту. Уладзімір Аляксандравіч тады не змарудзіў ні хвіліны, — тут жа ўзяўся за справу. Аперацыя была вельмі складаная, доўжылася амаль дзве гадзіны. Потым для далейшага лячэння малога на «хуткай» адвезлі ў бальніцу ў Бабруйск, дзе ён прабыў яшчэ паўтара месяца. Але ж выжыў, папраўіўся, дзякуючы нашаму глускаму хірургу.

Ужо тады жыхары мястэчка ведалі, што гэтага доктара вылучаюць найперш прафесіяналізм і чалавекалюбства. Расказвалі, напрыклад, як ён з таго свету вярнуў пенсіянера-п'яніцу. У таго была моцна пашкоджана печань, з-за крывацёку давялося «латаць» страўнік. Амаль шэсць гадзін хірург стаяў ля аперацыйнага стала.

Пацыент, расказвалі, быў вельмі ўражаны гэтым і расчулены: як — гэта дзеля яго, самотнага выпівакі?!

А потым... Можа, усвядоміў ён, да чаго даводзіць гарэлка, можа, хацеў аддзячыць хірургу, але ж пайшоў у міліцыю і «здаў» усіх, хто гнаў самагонку. Ён разлічыў правільна: меней будзе атруты, меней працы ў доктара...

З такіх вось эпізодаў і складвалася ўзаемная сімпатыя Глуска да Цісіневіча і Цісіневіча да Глуска. Па словах пацыентаў, гэты доктар успрымае чужы боль як свой. Калегі адзначаюць яго ўменне трымаць пад кантролем любую, нават самую складаную, сітуацыю. (Дарэчы, так у Глуску працавау і Аляксандр Сцяпанавіч Сямёнаў, заслужаны ўрач БССР, чыё імя носіць раённая бальніца.)

Пацыентам хірурга Цісіневіча амаль паўгода быў я сам, калі атрымаў цяжкую траўму пазваночніка. Уладзімір Аляксандравіч ніколі тады не праходзіў міма маёй палаты, не зазірнуўшы ў яе: калі па справе, а калі і «проста так» — пагутарыць, падтрымаць.

...Праляцелі гады і нават дзесяцігоддзі. Уладзімір Аляксандравіч ужо зняў з сябе паўнамоцтвы загадчыка аддзялення: працуе хірургам у паліклініцы і шчыра засмучаецца, што няма спецыялістаў, якія хацелі б лячыць людзей у глыбінцы. Прыехала вось у Глуск выпускніца медінстытута, але ж ці застанецца? «Мне, — кажа Уладзімір Аляксандравіч, — і ў галаву не прыходзіла шукаць сабе шчасця ў іншых бальніцах. Я, вясковы хлопец з Клецкага раёна, марыў аперыраваць, ратаваць людзей. А ў якім населеным пункце гэтым займацца — якая розніца? Галоўнае для спецыяліста — быць запатрабаваным».

Што-што, а вось гэта ў хірурга па-ранейшаму ёсць!

...Аднойчы ў раённай газеце я ўбачыў яго фотаздымак і захацеў намаляваць партрэт. Доўга рыхтаваўся. А зрабіўшы першы накід, папрасіў жонку, каб яна вынесла яго ў двор, паказала жанчынам. Мне цікава было, ці атрымалася, ці пазнаюць яны героя. Тыя толькі глянулі і адразу ж сказалі: «Дык гэта ж Цісіневіч!».

Мне заставалася хіба «ўдакладніць» нейкія рысы твару ды колер вачэй...

І вось мая праца скончана. Але ж ці спадабаецца яна доктару?

Хвалюючы момант: ён заходзіць, каб паглядзець мае болькі, я паказваю партрэт і бачу, як твар Уладзіміра Аляксандравіча асвятляецца нейкай дзіцячай радасцю, а потым сыплюцца словы падзякі...

Хоць, калі па шчырасці, найбольшым кампліментам для нас абодвух было тое, што доктара на маім партрэце пазнаў унук.

**Валерый ВАСІЛЕЎСКІ,**
*г. Глуск.*

■ Асабістае

# «МАЯ ЗЯМЛЯ, ДАСЦЬ БОГ, «ПЕРАХВАРЭЭ»...»

*Чарнобыльскі пыл, як смецце,*
*Вятры пазмятуць куды?*
*Жывём мы на гэтым свеце*
*Заложнікамі бяды.*

**Паэт і меў, і мае рацыю: чарнобыльскі пыл напраўду падзяліў жыццё на перыяды «да» і «пасля».**

«Пасля» ў нашым Чэрыкаўскім раёне ў зону першачарговага адсялення было аднесена больш за 30 вёсак — Бакунавічы, Каменка, Малінаўка, Чудзяны... У зоне наступнага апынуліся Рэчыца, Дубраўка, Зоры, Зябень... І мой Вепрын — адна з найбуйнейшых і найпрыгажэйшых вёсак. Яна знаходзілася ў 10 кіламетрах ад сумна вядомых Чудзян, дзе быў зафіксаваны найвышэйшы ў рэспубліцы ўзровень радыяцыйнай забруджанасці.

Я на той час была вучаніцай 9 класа і, як амаль усе ў той час, сапраўднай бяды не адчувала. Дарослыя не мелі праўдзівай інфармацыі, не разумелі ўздзеяння радыенуклідаў на арганізм чалавека (а тым больш наступстваў). Што ўжо казаць пра дзяцей? Нам проста дзіўна было чуць пытанне, як, маўляў, мы, бедныя, будзем жыць і вучыцца ў забруджаных вёсках?..

А мы проста жылі і вучыліся яшчэ пяць гадоў. Амаль цэлымі днямі ў школе нам даводзілася быць у памяшканнях. Там снедалі, абедалі, вячэралі, гулялі пад наглядам настаўнікаў. Напэўна, таму, калі прыходзілі дамоў, хацелася «адарвацца» — пабыць на вуліцы, пабегаць басанож.

Стрымлівала хіба тое, што побач працавалі салдаты ў спецыяльным адзенні, у рэспіратарах. Яны здымалі верхні пласт зямлі, а той, што заставаўся, засыпалі жоўтым пяском...

Потым у вёску завезлі партыю мышэй і пацукоў. Клеткі з імі стаялі ў хлявах вяскоўцаў. Яны давалі ім ежу і таблеткі, якія пакінулі навукоўцы.

У першы год грызуноў загінула няшмат, а вось на другі і трэці нібы напаў нейкі мор. Спецыялісты, якія прыязджалі з Мінска раз на паўгода, а то і радзей, толькі нешта запісвалі, забіралі ацалелых асобін ды прывозілі новых. А на роспыты вяскоўцаў адказвалі, што ўсё ідзе, як трэба, без адхіленняў, так, як яны і меркавалі...

Вельмі цяжка было, калі забаранілі есці сваё малако і гародніну, невыносна — бачыць спелыя грушы, яблыкі, слівы, ведаць іх смак — і баяцца сарваць, з'есці...

Пасля школы я паступіла вучыцца. Не перадаць, як чакала лістоў ад мамы! Вельмі хацелася ведаць, што ж там дома?

Як пісала матуля, «нічога такога»: хіба што кароў паздавалі... Забаранілі есці яйкі ад сваіх курэй... Падвоілі зарплату... Плацяць трыццаць рублёў «грабавых»... А галоўнае, ці не ў кожным лісце я чытала пра смерці — то сваякоў, то суседзяў... Што балюча, найчасцей паміралі мужчыны так званага сярэдняга веку. Магчыма, таму, што яны па-ранейшаму працавалі на зямлі — аралі, сеялі, убіралі ўраджай. Час гарачы, кабіны ў трактарах адкрытыя, шлейфам па полі пыл. І людзі ў ім — на тых жа сеялках — без рэспіратараў. Гэта падавалася тады амаль як геразім...

Цяпер я думаю, як мала мы ведалі, што такое радыяцыя, як свята верылі выключна ў «мірны» атам!

Мая студэнцкая група ў нашым Вепрыне дапамагала ўбіраць ураджай.

Толькі праз тры гады пасля катастрофы надрукавалі карту, дзе і якія грыбы можна збіраць. Як было сказана ў каментарыях, на маёй радзіме з кошыкам у лес хадзіць не трэба.

А хадзілі ж! Падхопішся, бывала, яшчэ на цямочку — і ў лес. Ідзеш па адных табе вядомых сцяжынках ад грыбовішча да грыбовішча, збочыш у малады бярэзнік, потым — на хвойнік, набярэш паўнюткі кашэль — у тым ліку баравікоў з белымі тоўстымі ножкамі, з чорнымі шапкамі.

Славілася мая вёска і сваімі, вельмі пранскімі, бэрамі. Цяпер гэтыя грушы сталі чарнобыльскімі. А вёскі ўжо няма: няма на карце Беларусі. Яна толькі ў сэрцах тых, хто нарадзіўся там, хто пажыў...

Вельмі добрыя, таленавітыя людзі былі ў Вепрыне. А як яны любілі працаваць!

І любяць. Слава пра наш калгас «Кастрычнік» (сёння — СВК пад кіраўніцтвам вопытнага аграрыя Пятра Лаўнікава) раней грымела на Чэрыкаўшчыне, а пасля перасялення стала грымець на Мсціслаўшчыне. Летась гаспадарка стала трэцяй і ў абласным спаборніцтве...

Але ж як было перажыць тое перасяленне, як было ўсё пакінуць — свае хаты, сады, сваю зямельку і родных, што засталіся на могілках? Варта ўспомніць — людзі дагэтуль плачуць.

